


**Пошук шыльдаў, напісаных па-беларуску, падобны да «ціхага палявання». «А дзе надпісы на беларускай мове? Праехаўшы па Мінску, ці шмат іх знойдзеш? Дзе ж у такім выпадку нашы гонар і годнасць?»**
СТАР. 3



**Факты выдачы зарплаты «ў канвертах» рэгулярна выяўляюцца, у прыватнасці, у сферы гандлю, тэхнічнага абслугоўвання і рамонту аўтамабіляў, будаўніцтва, паслуг таксі.**
СТАР. 5



**Апантаны археалогіяй «даследчык» вырашыў спрычыніцца да даследаванняў «чорных» папярэднікаў, чые вынікі дзейнасці былі прадэманстраваны падчас чытання навуковага даклада.**
СТАР. 6


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 лістапада 2012 г. АЎТОРАК № 223 (27338) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## КАМІТЭТ ДЗЯРЖБЯСПЕКІ ЯК АСНОЎНАЯ СПЕЦСЛУЖБА КРАІНЫ ПАВІНЕН АДПАВЯДАЦЬ СУЧАСНЫМ ПАТРАБАВАННЯМ

**Аб гэтым учора заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, прадстаўляючы старшыню КДБ Валерыя Вакульчыка кіруючаму складу органаў дзяржбяспекі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**




Фота БЕЛТА.

Прэзідэнт адзначыў, што Валерый Вакульчык з'яўляецца выхадцам з радоў супрацоўнікаў органаў дзяржбяспекі, стаяў ля вытокаў фарміравання і станаўлення Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Пры яго актыўным удзеле ствараўся і працягвае стварацца новы дзяржаўны орган — Следчы камітэт. «Сёння абедзве структуры працуюць эфектыўна. І заслуга ў гэтым, вядома, і Валерыя Паўлавіча. Яго арганізатарскія здольнасці і якасці кіраўніка-дзяржаўніка выявіліся ў канкрэтных справах. Галоўнымі прынцыпамі яго работы з'яўляюцца аб'ектыўнасць, кампетэнтнасць і адданасць нашай дзяржаве. Ведаю, што ён не прымае бяздзейнасці і славаблудства. Менавіта гэта прадвызначыла рашэнне аб прызначэнні яго кіраўніком асноўнай спецслужбы краіны», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Вельмі б хацеў спадзявацца, што гэты новы чалавек разам з вамі зробіць тую спецслужбу, якая павінна адказваць сучасным патрабаванням», — падкрэсліў беларускі лідар.

На думку кіраўніка дзяржавы, у КДБ, як і ў любым іншым калектыве, ёсць людзі, якія «хацелі б больш вольна сябе адчуваць, не хадзіць на працу, забываючы пра тое, што на плячах пагоны». «Вось тым трэба шукаць іншую працу. І вы не бойцеся, што ад вас кудысьці пойдуць людзі. Хай сыходзяць. Мы гатовыя, і нямала робім сёння, каб стварыць для чэкістаў самыя спрыяльныя ўмовы працы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Таму што я як Прэзідэнт бачу, што адбываецца вакол нашай краіны і ўнутры і якіх мне варта намаганняў, каб стрымаць краіну, каб яе на кавалкі не парэзалі і не расцягнулі, — працягнуў Аляксандр Лукашэнка. — Вы гэта таксама бачыце. Але бачыць — гэта адно, трэба прадпрымаць максімум намаганняў, каб стварыць цэласнасць, недатыкальнасць і бяспеку нашай краіны. Вось для такіх супрацоўнікаў мы гатовыя стварыць любыя ўмовы. Хай іх будзе не 12 тыс., не 10 тыс. і нават не 6 тыс. чалавек. Хай іх застанецца 3 тысячы, але гэта застануцца адданыя дзяржаве людзі. З такімі Вакульчык будзе працаваць. Усе астатнія куды хочуць хай сыходзяць».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што асноўным крытэрыем ацэнкі кіраўніка з'яўляецца здольнасць згуртаваць калектыў і стварыць абстаноўку рэзультатыўна-напружанай, але творчай работы.

Асноўнай прычынай адстаўкі Вадзіма Зайцава з пасады старшыні КДБ стала нездаровая маральна-псіхалагічная абстаноўка, якая склалася ў асобных падраздзяленнях Камітэта дзяржбяспекі, заявіў Аляксандр Лукашэнка. Паводле слоў Прэзідэнта, у аснову прычын адстаўкі ранейшага кіраўніка КДБ ляглі праблемы ў рабоце з асабовым складам, якія былі абазначаны на нарадзе 9 лістапада ў кіраўніка дзяржавы. «У першую чаргу — гэта нездаровая маральна-псіхалагічная абстаноўка, якая склалася ў асобных падраздзяленнях КДБ. Яна выкліканая недахопамі ў арганізацыі як кадравай, так і ідэалагічнай работы, а таксама перакос пры забеспячэнні ўласнай бяспекі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, прынятыя рашэнні, перш за ўсё, звязаныя з настроем і меркаваннем сярэдняга і ніжэйшага звяна супрацоўнікаў КДБ. «Я іх голас пачуў. Магу сказаць, ваш голас пачуў. Але па-мужчынску хачу вас папярэдзіць, што да вас прыйшоў кіраўнік «Зайцаў у квадраце». Гэта не той добры хлопец, якога, можа быць, хтосьці тут чакаў, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Гэта «Зайцаў у квадраце», але без лішніх заносаў, без галавацяпства, чалавек, нацэлены на прафесіяналізм, адзін з нямногіх, хто жалезабетонна ведае, чаго хоча Прэзідэнт ад КДБ».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў пачатку бягучага года на калегіі КДБ ужо абмяркоўваліся праблемы, якія ёсць у ведамстве. «Тады мною даваліся ўказанні перагледзець падыходы ў рабоце з асабовым складам. Аднак, да майго жалю, належныя высновы зроблены не былі. Больш за тое, некаторыя праблемы яшчэ больш абвастрыліся, сталі набываць негатыўны грамадскі рэзананс», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым ён згадаў пра сыход з жыцця падпалкоўніка Казака. «Натуральна я быў вымушаны звярнуць увагу на такую сітуацыю і прыняць сур'ёзныя меры. Спачатку быў адпраўлены ў адстаўку начальнік упраўлення ўласнай бяспекі КДБ, а следам і старшыня», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Тым не менш, яшчэ раз хачу падкрэсліць, калі хтосьці думае, што Зайцаў — гэта дрэнны і нягодны для КДБ чалавек... Можа, ён і нягодны, але не таму, што ён дрэнна служыў. Ён па-свойму разумеў свае задачы. Больш за тое, ён разам з вамі вырашаў гэтыя задачы, і на асобных напрамках вельмі эфектыўна», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

У прыватнасці, па словах кіраўніка дзяржавы, работа органаў дзяржбяспекі набыла больш сістэмны і нацэлены на прадметнае рашэнне задач характар. Павысіўся ўзровень інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці, контрразведвальніцкага забеспячэння дзяржаўных органаў. Прыняты меры па актывізацыі інфармацыйнага процiборства з нядобразычлівцамі і дэструктыўнымі сіламі, па ўмацаванні выканальніцкай і воінскай дысцыпліны сярод супрацоўнікаў КДБ. «Але была маса недахопаў, якія непрымальныя для КДБ», — заявіў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы таксама дадаў: «Зайцаў без працы не застанецца. І ніхто яго з краіны не збіраецца выпіхаць».

«Аднак, як я і казаў на нарадзе, пра гэта я казаў Зайцаву, галоўная каштоўнасць у нас — гэта людзі. А ў КДБ гэта, безумоўна, салдаты, афіцэры, генералы — воінскі калектыў, але гэта таксама людзі, і да іх трэба ставіцца па-чалавечы, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Тым больш, гэта людзі з асаблівымі якасцямі, адораныя, з мазгамі. А з разумнымі людзьмі трэба ўмець сябе паводзіць, у тым ліку і кіраўніка. І таму асноўны крытэрый ацэнкі кіраўніка — здольнасць згуртаваць калектыў, стварыць абстаноўку рэзультатыўна-напружанай, але творчай работы».

«Запомніце, у нас нямала праціўнікаў і ворагаў. З імі трэба бязлітасна змагацца. Але трэба давяраць тым людзям, якія вядуць гэтую барацьбу, і не трэба апрыёры ў кожным бачыць дрэннага чалавека. Для чэкісцкай арганізацыі гэта непрымальна», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

■ Гаспадары



## НА ЎСЕ ІНСТРУМЕНТЫ МАЙСТАР

**А інструментаў у жыхара вёскі Трасціно Уладзіміра Корнева што па частцы сталярнай, што па музычнай — як у музеі! Але галоўнае — ніводны інструмент не сумуе без патрэбы. Не сумуе таму, што ў гаспадара — залатыя рукі і на іх заўсёды ёсць попыт. І спеўная душа ў яго, нягледзячы на ўзрост. Зрабіць аконную раму ці дзверы, лазню скласці «ў лапу» ці на двухрадцы полечку зайграць — усё ён робіць аднолькава бездакорна і з натхненнем. Больш за тое, на Магілёўшчыне ён вядомы яшчэ як майстар па рамонце музычных інструментаў. А гэткіх спецыялістаў цяпер наогул адзінкі на ўсю краіну.**

У невялікай майстэрні-сталярні, якую зладзіў на сваім падворку Корнеў, усе сцены і паліцы запоўнены неабходным рыштункам — каб заўсёды былі пад рукамі. Безумоўна, ёсць тут месца і для гармоніка. Нават для цэлай калекцыі.

— Я самавук, ніхто мяне не вучыў. Ды і вучыць не было каму: бацька і старэйшы брат на вайне загінулі... — з сумам уздыхае Уладзімір Захаравіч.— Бацьку наогул не памятаю: яго па першай мабілізацыі ўзялі.

Сталярнічаць і цяслярыць Корнева прымусіла само жыццё: пасля вайны вяскоўцы будаваліся, і добрыя рукі былі ў цане. Навуку працы з сякерай і гэблікам ён лавіў на хаду, працуючы на падхваце ў старых майстроў-штукароў. З цягам часу і ў самога праца стала ісці спорна.

Свой першы гармонік Корнеў купіў у 1955-м, калі працаваў у геолагаразведцы ў Клімавічах: змалку яго вабіў гэты дзівосны інструмент. Кажа, пагляджу, як іншыя граюць, прыйду дадому і трэніруюся. Цяпер 74-гадовы жыхар Трасціно прызнаны не толькі ў сваім Хоцімскім раёне — у краіне ён адзін з лепшых гарманістаў. Сапраўдны віртуоз! Цяслярскія рукі, нягледзячы на доўгі працоўны век, яшчэ здольны дэманстраваць на клавішах вышэйшы «пілатаж». На конкурсах і фестывалях ён атрымлівае дыпломы і прэміі. Але галоўнае, што Уладзімір Захаравіч застаецца сапраўдным захавальнікам мясцовай выканальніцкай манеры ігры на гармоніку. Для захавання традыцыйнай культуры гэта вельмі важна.

— Хлебам не кармі, а пайграць дай, — кажа пра сябе гэты майстар. Ён змахвае з каленяў габлюшкі і «ўсаджвае» неразлучнага галасістага сябра...

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара**

ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый Карзюк, начальнік УДАІ Мінгарвыканкама:**

***«Пад'езды да мінскіх школ і дзіцячых садкоў будуць абсталяваны відэакамерамі і агараджальнымі канструкцыямі. Трэба ствараць тэхнічныя ўмовы, якія стануць перашкодай для парушэнняў, — гэта турнікеты, штучныя няроўнасці, сістэмы відэаназірання, асветленыя пешаходныя пераходы. Такія меры дазволяць аператыўна выявіць парушальнікаў правілаў дарожнага руху, стварыць перашкоды для машын на шляху дзіцяці ва ўстанову адукацыі. Таксама відэакамеры плануецца ўстанавіць у найбольш аварыйных месцах сталіцы».***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 7° |
| Віцебск | + 4° |
| Гомель | + 6° |
| Гродна | + 6° |
| Магілёў | + 5° |
| Мінск | + 5° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.11.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8510,00 | ▼ |
| Еўра | 10870,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 268,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1040,85 | ▲ |

## Тыдзень без дажджоў

**На бягучым тыдні на тэрыторыі Беларусі чакаецца ўплыў зоны павышанага ціску, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**

Таму з аўторка па чацвер істотных ападкаў не будзе. Месцамі чакаецца туман і слабы галалёд. Вецер паўднёва-ўсходні, слабы да ўмеранага. Тэмпература сёння 0 — плюс 5 градусаў.

У сераду і чацвер уначы будзе ад мінус 3 да плюс 2 градусаў, удзень — ад мінус 1 да плюс 3, на поўдні да плюс 5 градусаў. Айчынныя сіноптыкі падлічылі, што такі тэмпературны фон на 1—2 градусы вышэй за норму.

Паводле папярэдніх прагнозаў, і ў пятніцу не чакаецца істотных ападкаў. Толькі ў Віцебскай вобласці ў асобных раёнах пройдзе невялікі мокры снег і часам дождж. Уначы — ад мінус 3 да плюс 2, удзень — ад мінус 1 да плюс 2 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ «Прамая лінія»

## ЯК ЦЫВІЛІЗАВАНА ВЫРАШАЦЬ ЖЫЛЛЁВАЕ ПЫТАННЕ?

**У пятніцу, 23 лістапада, рэдакцыя газеты «Звязда» сумесна з кіраўніцтвам Цэнтра гандлю нерухомасці «ПАКАДАН» арганізуе завочную «прамую лінію», якая тычыцца ўсіх актуальных пытанняў жыллёвай тэматыкі.**

Калі вас хвалююць пытанні набыцця кватэр на другасным рынку жылля гарадоў Беларусі, нюансы абмену жылых памяшканняў, існуючыя механізмы долевага будаўніцтва і любыя іншыя аспекты, звязаныя з купляй, будаўніцтвам і арэндай жылля — звяртайцеся. Пытанні прымаюцца на электронны адрас рэдакцыі info@zvyazda.minsk.by і па тэлефоне (017) 287 17 51.

Падчас завочнай «прамой лініі» на атрыманыя пытанні чытачоў газеты адкажа генеральны дырэктар Цэнтра гандлю нерухомасці «ПАКАДАН» Павел Яўгенавіч Астапеня.

■ Актуальна

## У ЭКСПЕРЫМЕНТ ПА ФІНАНСАВАННІ ШКОЛ БУДЗЕ ЎЦЯГНУТЫ ЦЭЛЫ ГОРАД?

**На думку міністра адукацыі Сяргея Маскевіча, эканамічная эфектыўнасць функцыянавання адукацыйнай галіны патрабуе больш пільнага вывучэння і перагляду.**

— У Беларусі ў сферу адукацыі накіроўваюцца 6% ад унутранага валавога прадукту — гэта адзін з найлепшых паказчыкаў у Еўропе і найлепшы паказчык на постсавецкай прасторы, — паведаміў Сяргей Маскевіч на VII з'ездзе Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, які адбыўся днямі ў Мінску. — Безумоўна, ва ўмовах эканамічнай стабільнасці дзяліць «бюджэтны пірог» значна прасцей, але ў апошнія паўтара года нам тэрмінова даводзілася вырашаць вельмі шмат актуальных пытанняў: і з харчаваннем дзяцей у дзіцячых садках, і са студэнцкімі стыпендыямі, і са студэнцкімі інтэрнатамі, і гэтак далей. І я далёка не ўпэўнены, што ўсё зрабілі ідэальна, але мы вельмі стараліся. Сёння востра паўстала пытанне з заробкамі педагогаў. Мы ні ў якім разе не адмаўляем гэтую праблему. Адукацыя, як самая буйная бюджэтная сфера, аказалася ў няпростай сітуацыі. Але што нам рабіць далей: прасіць аб павелічэнні асігнаванняў у нашу галіну? Дапусцім, выдаткі на адукацыю будуць складаць 7% ад ВУП. Але ж ці вырашым мы ўсе свае пытанні? Акрамя таго, і магчымасці бюджэту не бязмежныя...

СТАР. 2

## ЯКАЯ ЯНА, ШЧАСЛІВАЯ СЯМ'Я?




**30 лістапада ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры пройдзе суперфінал першага рэспубліканскага конкурсу «Сям'я года». Добрая сям'я не падае з неба, не дастаецца дарма, не складаецца сама сабой. Яна, як і любое чалавечае тварэнне, патрабуе нястомных намаганняў, увагі і цярпення. І хто сказаў, што беларусы не здольны на гэта? Добрых сем'яў у нас шмат. Якія яны? Некалі Леў Талстой сказаў, што ўсе шчаслівыя сем'і шчаслівыя аднолькава. І падобныя адна на адну. Ці так гэта? Давайце высветлім на прыкладзе сямі сем'яў, якія выйшлі ў суперфінал конкурсу.**

СТАР. 3

■ Дэмаграфія

## НАТУРАЛЬНЫ ПРЫРОСТ НАСЕЛЬНІЦТВА АДЗНАЧАНЫ Ў 70 ГАРАДАХ І 23 ГАРАДСКІХ ПАСЁЛКАХ КРАІНЫ

**Натуральны прырост насельніцтва ў студзені-верасні бягучага года зафіксаваны ў 70 са 112 гарадоў Беларусі і ў 23 з 92 пасёлкаў гарадскога тыпу. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.**

Колькасць народжаных кампенсавала колькасць памерлых у 2 гарадах і 1 пасёлку гарадскога тыпу. Натуральны прырост сельскага насельніцтва адзначаны ў Мінскім (726 чалавек) і Брэсцкім (17 чалавек) раёнах.

Колькасць насельніцтва рэспублікі на 1 кастрычніка 2012 года склала 9 млн 459,8 тыс. чалавек і ў параўнанні з пачаткам бягучага года зменшылася на 5,4 тыс. чалавек. Скарачэнне колькасці насельніцтва абумоўлена перавышэннем колькасці памерлых над колькасцю народжаных (на 8 тыс. 671 чалавека) пры дадатным міграцыйным прыросце (3 тыс. 283 чалавекі).

У студзені-верасні бягучага года ў Беларусі нарадзіліся 84,9 тыс. дзяцей — на 4 тыс. больш, чым за аналагічны перыяд 2011 года. Памерлі 93,6 тыс. чалавек, або на 8,3 тыс. чалавек менш.

Найбольшы натуральны прырост насельніцтва (3 тыс. 556 чалавек) у студзені-верасні 2012 года адзначаны ў Мінску. Каэфіцыент натуральнага прыросту ў сталіцы склаў 2,5 чалавека на 1000 жыхароў. Найбольшы каэфіцыент натуральнага змяншэння насельніцтва склалася ў Віцебскай вобласці — 4,8 праміле.

ISSN 1990 - 763X

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### РАСІЯ СТАЛА ПЕРШАЙ У СВЕЦЕ ПА ЗДАБЫЧЫ НАФТЫ



Расія прызнаная найбуйнейшай нафтаздабыўнай краінай у свеце. З паказчыкам больш за 10 млн барэляў за суткі яна апярэджвае другога лідара — Саудаўскую Аравію. Паводле звестак Сумеснай ініцыятывы па нафтавай статыстыцы, у верасні Расія здабывала 10 млн барэляў за суткі, у той час як Саудаўская Аравія — 9,72 млн. Паводле прагнозаў Міжнароднага энергетычнага агенцтва (МЭА), ЗША выйдуць на першае месца па здабычы нафты да 2020 года, апярэдзіўшы цяперашніх лідараў — Расію і Саудаўскую Аравію. У той жа час эксперты МЭА прагназуюць, што барэль сырой нафты да 2035 года будзе каштаваць 125 долараў, а сусветны попыт на «чорнае золата» ўзрасце на 14% і складзе 99,7 млн барэляў у суткі. Таксама яны адзначылі, што сёння вялікая частка нафты, якая здабываецца ў свеце, ідзе на вытворчасць паліва для транспарту.

### У МАСКВЕ ЖАНЧЫНА НА «ХОНДЗЕ» ЗНЕСЛА ПРЫПЫНАК З ЛЮДЗЬМІ

У панядзелак на Анежскай вуліцы ў расійскай сталіцы адбылася чарговая буйная аварыя. Кіроўца на аўтамабілі «Хонда» не справілася з кіраваннем і ўрэзалася ў слуп, размешчаны ў двух метрах ад аўтобуснага прыпынку, на якім чакалі транспарт людзі. У выніку ахвярамі ДТЗ сталі тры чалавекі, паранены яшчэ двое. Віноўніцай трагедыі стала 40-гадовая Ганна Нікіфарава. Яна рухалася на сваім джыпе па Анежскай, калі раптам страціла кіраванне. Сама Нікіфарава знаходзіцца ў цяжкім стане. Як паведамілі ў прэс-службе сталічнага главка МУС, «за ўладальніцай аўтамабіля лічыцца не менш за шэсць штрафаў за парушэнні ПДР».

### ПАМЁР САЛІСТ «СІНЯЙ ПТУШКІ» СЯРГЕЙ ДРАЗДОЎ



У Тамбове ў выніку цяжкай працяглай хваробы ва ўзросце 57 гадоў памёр саліст легендарнай савецкай групы «Сіняя птушка», ураджэнец вёскі Мільча Гомельскай вобласці Сяргей Драздоў. ВІА «Сіняя птушка» быў заснаваны ў 1972 годзе ў Гомелі. Група праіснавала ў першапачатковым складзе да 1991 года. Калі калектыў вярнуўся з гастроляў па ЗША, у ранейшым складзе больш не збіраўся. Драздоў выступаў у групе ў якасці саліста і граў на бас-гітары. Скончыў музычную школу па класе балалайкі, а затым паступіў у музычнае вучылішча. З «Сіняй птушкі» ён пайшоў у 2002 годзе і заснаваў ансамбль «Сіняя птушка Сяргея Драздова». Музыкант праславіўся выкананнем такіх хітоў, як «Там, дзе клён шуміць», «На ростанях», «Я іду табе насустрач», «Маміна пласцінка», «Дык вось якая ты».

### КОРАТКА

18 лістапада грамадзяне Беларусі трапілі ў ДТЗ у Польшчы. Аварыя адбылася на аб'язной дарозе на з'ездзе ў накірунку Познані. Аўтамабіль з беларускімі нумарамі ўдарыўся ў бетонную агароджу і загарэўся. У выніку аварыі тры чалавекі загінулі, а двухгадовае дзіця цудам засталося жывым

Аляксандру Варламаву прад'яўлена канчатковае абвінавачанне ва ўчыненні злачынстваў, якія прадугледжваюць адказнасць за ўчыненне махлярства ў асабліва буйным памеры. У якасці сведак па крымінальнай справе дапрошаны больш як 800 чалавек. Пацярпелымі прызнаны 353 асобы.

У ВНУ Беларусі вучацца больш за 12 тыс. замежных грамадзян з 88 краін свету. Найбольш замежных студэнтаў у Беларусі з Туркменістана — 5 тыс. 889 чалавек (48,5 працэнта), Кітая — 2 тыс. 68 чалавек (17 працэнтаў) і Расіі — 1 тыс. 11 чалавек (8,3 працэнта).

## ДЛЯ ЧАГО ЧАЛАВЕКУ ПАТРЭБНЫ ГРОШЫ?



**Дар'я Спяцанава, студэнтка ФФСН БДУ:**

— Як бы банальна гэта не гучала, грошы патрэбны ўсім і заўсёды. Ад гэтага нікуды не падзецца. Мы самі надалі грошам такую «ўладу». Без грошай, на жаль, немагчыма задаволіць фізіялагічныя і духоўныя патрэбы чалавека. І гэта выклікае пастаяннае імкненне да грошай і іх назапашвання. Але мары людзей толькі часткова здзяйсняюцца праз грошы: яны ажыццяўляюць не ўсё і не заўсёды!



**Дзяніс Марціновіч, аспірант гістарычнага факультэта БДУ, аглядальнік газеты «Літаратура і Мастацтва»:**

— Яшчэ Сакрат калісьці сказаў, што прымае ежу, каб жыць, а не жыве, каб есці. Калі перафармуляваць яго адказ, любому чалавеку патрэбныя грошы, каб годна існаваць, мець магчымасць займацца любімай прафесіяй, падарожнічаць, развівацца як асоба. Бо чалавек, які жыве толькі для таго, каб зарабіць долары, еўра ці беларускія рублі, пераўтвараецца ў бальзакаўскага Габсэка, які, як вядома, не вельмі добра скончыў.



**Вікторыя Дзяшкоўская, педагог дадатковай адукацыі, кіраўнік клуба гістарычнай рэканструкцыі «Карона Захаду»:**

— Грошы — маленькія каляровыя паперкі, якія нясуць у сабе вялікі сэнс. За грошы мы купляем адзенне, ежу, глядзім тэлевізар, адпачываем і гэтак далей. Інача: грошы — гэта аснова нашага дабрабыту, і чым іх больш, тым лепшы наш дабрабыт. А што ёсць шчасце для кожнага чалавека? Падумайце, ці можна быць шчаслівым у галечы, голадзе, хваробах? Ці думае пра шчасце чалавек у такія моманты? Пра што ён думае? Часцей за ўсё пра грошы. Беражыце свае грошы, любіце іх, выдаткоўвайце абдумана, зарабляйце іх. І будзеце шчаслівым чалавекам.

**Падрыхтаваў Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

# ЗАКАНАДАЎСТВА ПА ПЫТАННЯХ ЭКСПАРТНАГА ЛІЗІНГУ БУДЗЕ ПЕРАГЛЕДЖАНА

**Гэта тэма знаходзілася ў цэнтры ўвагі 19 лістапада на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з міністрам эканомікі Мікалаем Снапковым і памочнікам кіраўніка дзяржавы Пятром Пракаповічам, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Лізінгавая дзейнасць з'яўляецца адным з напрамкаў развіцця экспарту.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў сувязі з работай у Мытным саюзе ўзнікла неабходнасць перагледзець заканадаўства па пытаннях лізінгу, правы лізінгадаўца, лізінгаатрымальніка.

Урад прапануе ўнесці некаторыя змяненні ў існуючую мадэль. У прыватнасці, у выпадку калі лізінгаатрымальнік па якіх-небудзь прычынах стаў неплацежаздольным і яго неплацежаздольнасць дакументальна пацверджана, то прадмет лізінгу можа застацца на тым рынку, дзе працуе лізінгаатрымальнік, без вяртання ў краіну. Гэта дае магчымасць эканоміць на транспартных расходах. Лізінгадаўцу, гэта значыць нацыянальнаму аператару або аператару, які прадстаўляе інтарэсы нашай краіны, прадастаўляецца права на гэтай жа тэрыторыі або ў бліжэйшых краінах рэалізаваць прадмет лізінгу з дапамогай дзвюх аперацый: арэнды і продажу. У першую чаргу размова ідзе аб тэхніцы. У экспартным лізінгу транспарт займае 64 працэнты.

Такі механізм з'яўляецца звычайнай сусветнай практыкай. Кантроль за вяртаннем валютнай выручкі ў краіну ад продажаў у лізінг ажыццяўляецца Нацыянальным банкам.

Кіраўнік дзяржавы адобрыў прапанаваныя ўрадам падыходы і даў адпаведнае даручэнне аб пачатку іх рэалізацыі.

# БЕЛАРУСБАНК ПРЫПЫНЯЕ ВЫДАЧУ КРЭДЫТАЎ НА КУПЛЮ ЖЫЛЛЯ ТОЛЬКІ ДА КАНЦА 2012 ГОДА

**ААТ «ААБ Беларусбанк» прыпыняе выдачу крэдытаў на куплю жылля толькі да канца 2012 года. Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе ААТ «ААБ Беларусбанк», каментуючы рашэнне праўлення банка аб прыпыненні выдачы крэдытаў на набыццё індывідуальных жылых дамоў і кватэр.**

Беларусбанку на 2012 год устаноўлены аб'ём выдачы крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) і набыццё жылля ў памеры Br250 млрд. Гэта было прадугледжана пастановай Саўміна ад 30 снежня 2011 года № 1788 «Аб мерах па выкананні заданняў на 2012 год па будаўніцтве жылых дамоў». Сума выдадзеных грамадзянам на 15 лістапада 2012 года крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) і набыццё жылля і прынятых абавязацельстваў па заключаных крэдытных дагаворах на названыя мэты перасягае зацверджаны ўрадам гадавы аб'ём фінансавання. Таму і прынята рашэнне аб прыпыненні выдачы крэдытаў.

Пры гэтым у банку падкрэслілі, што гэта рашэнне не распаўсюджваецца на крэдыты для маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў шматдзетных сем'яў, якія маюць трое і больш непаўналетніх дзяцей. Акрамя таго, банкам будуць разгледжаны заявы грамадзян на выдачу крэдытаў на набыццё жылля, прынятыя да 16 лістапада 2012 года.

У банку нагадалі, што крэдыты выдаюцца грамадзянам, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Яны прадастаўляюцца тэрмінам да 20 гадоў, працэнтная стаўка 20 працэнтаў гадавых за фактычны час карыстання крэдытам. Для грамадзян, якія пастаянна пражываюць і працуюць (атрымліваюць пенсію з рахункаў (картак-рахункаў), адкрытых у ААТ «ААБ Беларусбанк), якія будуюць (рэканструююць) або набываюць жылыя памяшканні ў населеных пунктах з колькасцю насельніцтва да 20 тыс. чалавек, працэнтная стаўка складае 19 працэнтаў гадавых за фактычны час карыстання крэдытам.

Грамадзянам, якія не маюць патрэбы ў паляпшэнні жыллёвых умоў, крэдыты прадастаўляюцца тэрмінам да 15 гадоў да 75 працэнтаў кошту будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця агульнай плошчы жылога памяшкання: стаўка рэфінансавання Нацбанка на дату заключэння крэдытнага дагавора плюс 3 працэнты гадавых. У крэдытным дагаворы называецца памер працэнтнай стаўкі ў абсалютным значэнні на дату заключэння крэдытнага дагавора. Пры змяненні стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка памер працэнтнай стаўкі па раней заключаных крэдытных дагаворах не змяняецца, калі іншае не прадугледжана крэдытным дагаворам.

Шматдзетным сем'ям з трыма і больш непаўналетнімі дзецьмі, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, крэдыты прадастаўляюцца тэрмінам да 20 гадоў па стаўцы 17 працэнтаў гадавых за фактычны час карыстання крэдытам. Сукупны памер прадастаўленага крэдыту на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылога памяшкання не павінен перасягаць 90 працэнтаў кошту будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылога памяшкання (для шматдзетнай сям'і — 95 працэнтаў).

Грамадзянам, якія ўключаны ў спісы льготнага крэдытавання для будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылых памяшканняў і выказалі жаданне адначасова атрымаць крэдыт на ўмовах, вызначаных банкам, на фінансаванне гэтага ж жылога памяшкання, выдача крэдыту ажыццяўляецца на ўмовах для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

# У ЭКСПЕРЫМЕНТ ПА ФІНАНСАВАННІ ШКОЛ БУДЗЕ ЎЦЯГНУТЫ ЦЭЛЫ ГОРАД?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прывяду толькі некалькі фактаў для роздуму. У савецкія часы на аднаго настаўніка прыпадала 10 вучняў, а сёння ў нас на аднаго настаўніка прыпадае 8 вучняў. У Літве — 12 вучняў, а ў Германіі — 15! Чаму ў адной установе адукацыі адзін вучань абыходзіцца бюджэту ў 7 мільёнаў рублёў, а ў іншай — у 18?! Чаму ў адной ВНУ сярэдні заробак прафесарска-выкладчыцкага саставу ў 1,5 раза большы, чым у іншай? Магчыма, хтосьці проста больш эфектыўна працуе і ўмее больш рацыянальна размяркоўваць свой бюджэт?

Па меркаванні міністра адукацыі, нават калі сёння ўсё пакінуць так, як было раней, то праз тры — пяць гадоў усё роўна давядзецца вяртацца да пытанняў эканамічнай эфектыўнасці работы галіны. Таму трэба выпрацаваць дакладную тактыку на самы бліжэйшы час.

Сяргей Маскевіч не адмаўляе тую акалічнасць, што ў будучыні колькасць занятых у сістэме адукацыі будзе змяншацца:

— Чаму, калі змяншаецца колькасць навучэнцаў і студэнтаў, колькасць педагогаў павінна заставацца ранейшай? Напэўна, толькі ў сістэме дашкольнай адукацыі сёння няма рэзерваў для аптымізацыі штату... Затое ёсць вялікі рэзерв з напаўняльнасцю класаў, таму мы будзем ініцыяваць унясенне адпаведных змяненняў у Кодэкс аб адукацыі, — падкрэсліў кіраўнік галоўнага адукацыйнага ведамства. — Мы павінны прыйсці да больш справядлівай сістэмы размеркавання грошай у адукацыі. У сувязі з гэтым вялікія надзеі мы ўскладаем на эксперымент па ўкараненні новай мадэлі фінансавання, калі грошы будуць накіроўвацца ва ўстанову адукацыі з разліку на кожнага вучня. Першапачаткова планавалася задзейнічаць у эксперыменце толькі асобныя ўстановы адукацыі, але сёння мы лічым патрэбным уключыць у эксперымент цэлы горад. Калі наша пазіцыя знойдзе падтрымку, то ўдзельнікамі эксперыменту стануць усе агульнаадукацыйныя ўстановы горада Баранавічы. Усё сродкі, якія будуць там сэканомлены, застануцца ў адукацыі, і кіраўнікі самі будуць вырашаць, як імі распараджацца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ■ На слыху

### П'ЯНЫ ВАДЗІЦЕЛЬ ДВОЙЧЫ ЗА ДЗЕНЬ ПАПАЎСЯ ІНСПЕКТАРАМ ДАІ Ў МІНСКУ

**Пра гэта БЕЛТА паведаміла старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Фрунзенскага раёна сталіцы Алена Волчак.**

Паведамленне пра нецвярозага вадзіцеля за рулём паступіла ў ДАІ ад відавочцаў удзень 17 лістапада. Экіпаж ДАІ выбыў па сігнале і на вуліцы Фёдарава спыніў аўтамабіль «Опель», вадзіцель якога быў п'яны. Яго адвезлі на медыцынскі агляд — у 60-гадовага мужчыны ў крыві выявілі 2 праміле алкаголю. «Опель» забралі на штрафстаянку.

Літаральна праз паўтары гадзіны ў ДАІ зноў патэлефанавалі — у мінакоў узнікла падазрэнне, што вадзіцель аўтамабіля «Кіа», які рухаўся па вуліцы Лабанка паблізу гандлёвага кірмашу, знаходзіцца ў нецвярозым стане. Праз нейкі час «Кіа» спынілі. Вадзіцелем аказаўся той самы мужчына. «Опель» належаў яго жонцы, а ў другі раз ён выехаў на ўласным аўто, як патлумачыў сам, па цыгарэты. Другі аўтамабіль таксама адвезлі на штрафстаянку. У дачыненні да вадзіцеля складзена 2 адміністрацыйныя пратаколы.

### ГРУЗАВІК СУТЫКНУЎСЯ З ТРАКТАРАМ

**На аўтадарозе Віцебск — Гомель у раёне вёскі Хлусава Аршанскага раёна грузавік сутыкнуўся з трактарам «Беларус».**

— Грузавы аўтамабіль «Мерседэс» пад кіраваннем 33-гадовага жыхара Магілёва а сёмай гадзіне вечара здзейсніў сутыкненне з трактарам «МТЗ-52» з прычэпам, які рухаўся ў спадарожным кірунку. «Жалезным канём» кіраваў 32-гадовы жыхар Барысава, — паведамілі ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях. — У выніку гэтага ДТЗ у кабіне аўтамабіля «Мерседэс» быў заблакіраваны кіроўца. Супрацоўнікамі МНС з дапамогай гідраўлічнай аварыйна-выратавальнай прылады з аўтамабіля кіроўцу выцягнулі. Брыгадай хуткай медыцынскай дапамогі ён быў шпіталізаваны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### КАЗАХСКАГА ЗАБОЙЦУ ЗАТРЫМАЛІ...

**У Нацыянальным аэрапорце «Мінск» затрыманы грамадзянін Казахстана, які каля 20 гадоў вышукваўся праваахоўнікамі гэтай краіны за ўчыненае забойства.**

Паводле звестак упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі, мужчына 1971 г.н. прыбыў у аэрапорт «Мінск» з Абу-Дабі (Аб'яднаныя Арабскія Эміраты) як грамадзянін Кыргызстана. Прад'яўлены ім пашпарт аказаўся фальшывым. Камітэт крымінальнай паліцыі МУС Рэспублікі Казахстан вышукваў гэтага чалавека з 1993 года за разбойны напад, забойства, вынішчэнне маёмасці, хуліганства, незаконнае набыццё, захоўванне і нашэнне зброі, набыццё наркотыкаў. Яго затрымалі на падставе інфармацыі, атрыманай ад казахскіх калег.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

**ОАО «Гомельхлебопродукт»**
**извещает своих акционеров о проведении внеочередного общего собрания акционеров ОАО «Гомельхлебопродукт» 30 ноября 2012 года.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**
1. О внесении изменений в устав Общества.

Собрание состоится по адресу: **г. Гомель, ул. Мазурова, 48.**
Начало **в 14.00.**
С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться по адресу: **г. Гомель, ул. Мазурова, 48.**
Регистрация участников собрания будет проводиться с 13.00 до 13.45 в день и по месту проведения собрания. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 400010980 *Наблюдательный совет ОАО «Гомельхлебопродукт».*

## ■ Акцэнты тыдня з Вадзімам Гігіным

# МАЛЕНЬКАЯ ВАЙНА І «ВЯЛІКІЯ» ІНТАРЭСЫ



**У нас.** Вялікая восеньская хваля — так можна назваць шэраг значных кадравых прызначэнняў, які адбыліся (і трэба думаць, працягнуць адбывацца) у вышэйшым эшалоне беларускай улады. Нічога непрадказальнага тут няма. Тое, што адразу пасля парламенцкіх выбараў непазбежны пэўныя перамяшчэнні шэрагу адказных асоб, было не толькі відавочна, але прама выцякала з беларускай палітычнай традыцыі апошніх гадоў.

Можа, самым незвычайным стала прызначэнне паслом у Францыю Паўла Латушкі. Дакладней, ні ў самой адстаўцы (яе многія даўно чакалі), ні ў прызначэнні (Павел Паўлавіч з'яўляецца кар'ерным дыпламатам) нічога дзіўнага няма. Нязвыклымі былі і даручэнні, якія даў новаму паслу кіраўнік дзяржавы.

Па-першае, Аляксандр Лукашэнка асобна падкрэсліў, што на дыпламатычную працу Павел Латушка папрасіўся сам. Відавочна, што гэта было зроблена ў адказ на розныя пагалоскі яшчэ напярэдадні самой адстаўкі.

Па-другое, Прэзідэнт даручыў Латушку вывучыць вопыт дзейнасці Сацыялістычнай партыі Францыі, а потым далажыць вынікі разгляду яму асабіста. Пры гэтым ён не выключыў, што ў хуткім часе падобная партыя можа з'явіцца і ў Беларусі. Адначасова Аляксандр Лукашэнка даў даволі станоўчую характарыстыку працы свайго французскага калегі Франсуа Аланда.

На маёй памяці гэта ўпершыню, калі прэзідэнт дае паслу такое даручэнне. Звычайна кіраўнікам дыпламатычных місій Беларусі за мяжой ставяцца найперш эканамічныя задачы, а палітыка ідзе на другім месцы. Патлумачыць такую незвычайнасць на гэты раз можна дзвюма прычынамі.

Улады робяць стаўку на далейшае развіццё партыйнай сістэмы ў краіне. Вядзецца актыўная праца, хай і не бачная звычайнаму воку, па фарміраванні ідэалогіі грамадскага аб'яднання «Белая Русь», якому, хутчэй за ўсё, наканавана стаць партыяй. Пра тое, што сацыялістычныя ідэі могуць скласці аснову яе праграмы, гаворка ішла ўжо даўно.

Акрамя таго, добрыя словы на адрас Франсуа Аланда могуць азначаць імкненне афіцыйнага Мінска змяніць галоўнага партнёра па перамовах з боку ЕС. Раней у гэтай ролі выступала Германія. Але яе пазіцыя выклікае ўсё большае раздражненне ў Беларусі. Таму мы можам чакаць актывізацыі беларуска-французскіх кантактаў менавіта ў палітычнай сферы.

**Вакол нас.** Вайны на Блізкім Усходзе чакалі. Аднак зусім не там, дзе яна выбухнула. Дакладней, баявыя дзеянні ў сектары Газа — яшчэ не зусім сапраўдная вайна. Але чалавечыя ахвяры самыя сапраўдныя.

Абвастрэнне ізраільска-палесцінскіх адносін аказалася на руку амаль усім палітычным сілам у рэгіёне.

Ураду Біньяміна Нетаньяху як паветра патрэбна «маленькая пераможная вайна». Кіруючая кааліцыя ўвесь час знаходзіцца пад пагрозай развалу. І патрыятычныя заявы, абарона насельніцтва ад звыклага ворага — правераны спосаб захавання ўлады і аб'яднання розных палітычных сіл.

Крывавая эскалацыя ідзе на карысць і палесцінскім палітыкам, прычым з розных палюсоў. Для Махмуда Абаса і яго руху ФАТХ — гэта шанц пераадолець раскол у грамадстве, які ўзнік пасля канфлікту з ХАМАС у 2007 годзе. Для самога ХАМАСа ізраільская агрэсія — выратаванне, бо на фоне эканамічных цяжкасцяў аўтарытэт руху ў сектары Газа стаў падаць, і ён фактычна сам справакаваў адказныя дзеянні «сіянісцкага ворага».

У новым ізраільска-палесцінскім канфлікце зацікаўлены і краіны «арабскай вясны». Пасля першай рэвалюцыйнай эйфарыі новыя ўрады сталі перад вялікімі і цяжкімі задачамі найперш гаспадарчага характару. У грамадстве стала ўзрастаць хваля незадаволенасці вынікамі саміх «рэвалюцый». І антыізраільская рыторыка, заклікі да арабскай салідарнасці могуць адцягнуць, хаця б і на пэўны час, увагу грамадзян Туніса, Лівіі, Егіпта ад уласных праблем.

Як гэта не дзіўна, маленькая вайна ў Газе адпавядае інтарэсам Дамаска і Тэгерана. Для першага гэта магчымасць спадзявацца на часовае пераключэнне ўвагі і Захаду, і арабскага свету з уласнай грамадзянскай вайны на больш звыклы канфлікт. Для Ірана відавочным з'яўляецца тое, што Ізраіль не адважыцца на паветраны ўдар па аб'ектах у Ісламскай рэспубліцы пакуль не вырашана праблема Газы.

На жаль, людзі — як у Ізраілі, так і ў Палесціне па-ранейшаму застаюцца закладнікамі гэтых «вялікіх палітычных інтарэсаў».

**З гісторыі.** На 12 лістапада прыпадае дата някруглая. Але яе значэнне і след у нашай гісторыі ад гэтага не меншыя. У гэты дзень у 1623 годзе пачалося Віцебскае паўстанне — самае буйное выступленне беларускага насельніцтва супраць гвалтоўнага насаджэння царкоўнай уніі.

Да таго часу ўнія фармальна існавала ўжо больш за чвэрць стагоддзя. Аднак сучаснікі пісалі, што ўніяцкая царква — гэта святары без паствы. Праваслаўныя ў сваёй большасці не прынялі рашэнні Брэсцкага сабора. Разгарнулася палемічная барацьба — бадай што вяршыня развіцця старажытнабеларускай літаратуры. Прыхільнікі ўніяцкай ідэі відавочна прайгравалі сваім праціўнікам. І тады на месца палемістаў прыйшлі людзі з іншымі якасцямі. Галоўны з іх — архіепіскап Іасафат Кунцэвіч. Ён стаў забараняць праваслаўным спраўляць шлюбы, хрысціць дзяцей, адпяваць памерлых, нават прыстойна хаваць іх. Святароў арыштоўвалі і накіроўвалі ў астрог.

Крутыя метады Кунцэвіча выклікалі заклапочанасць нават улад, якія ўнію падтрымлівалі. Захаваліся лісты Льва Сапегі да архіепіскапа, у якіх ён перасцерагае таго ад ужывання гвалту. Канцлер ведаў, пра што пісаў.

Выступленні супраць Кунцэвіча ўжо адбываліся ў Магілёве і Полацку. Дарэчы, жыхары гэтых гарадоў прынялі ўдзел у падрыхтоўцы паўстання ў Віцебску. Нарэшце, 12 лістапада ўдарылі званы гарадской ратушы і праваслаўных храмаў. Тысячы ўзбуджаных гараджан накіраваліся да двара архіепіскапа. Нянавісць да Кунцэвіча была такой лютай, што натоўп літаральна разарваў яго. Цела забітага цягалі па вуліцах, а потым скінулі ў Заходнюю Дзвіну.

Расправа ўлад не толькі над удзельнікамі паўстання, але Віцебскам увогуле была вельмі жорсткай. 120 гараджан прыгаварылі да смяротнага пакарання (праўда, большасць здолела ўцячы). Горад пазбавілі магдэбургскага права і ўсіх прывілеяў, наклалі вялікі грашовы штраф. Ратушу зруйнавалі, усе званы горада былі пераліты ў адзін у памяць пра Кунцэвіча, якога прызналі «блажэнным». Кіраваў распраўай асабіста Леў Сапега.

Але памяць пра тое паўстанне захавалася ў народзе. Нездарма Уладзімір Караткевіч прысвяціў тым падзеям адну з лепшых сваіх п'ес — «Званы Віцебска». ■

# СПАБОРНІЧАЦЬ У СТВАРЭННІ ЎМОЎ ДЛЯ ІНВЕСТАРАЎ

**Такую думку выказаў дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор Рапота на VII Беларускім інвестыцыйным форуме, што праходзіў у Мінску.**

«І ў Беларусі, і ў Расіі трэба падумаць аб далейшым паляпшэнні ўмоў для інвестараў», — сказаў дзяржсакратар. Прагрэс у гэтай сферы, на яго думку, відавочны, але ідэальная сітуацыя будзе выглядаць так: «Не інвестар ходзіць па кабінетах чыноўнікаў, а мясцовыя ўлады спаборнічаюць паміж сабою ў прадастаўленні найбольш спрыяльных умоў». Між іншым, саюзныя праекты, па словах Рыгора Рапоты, — гэта інвестыцыі ў эканоміку абедзвюх краін. Ён лічыць, што вялікая перавага Саюзнай дзяржавы заключаецца ў стварэнні адзінага рынку: «У распараджэнні інвестара, які прыходзіць у Беларусь, аказваецца фактычна ўвесь рынак Расійскай Федэрацыі дзякуючы адсутнасці мытных бар'ераў».

Пазітыўна ацэньвае дзяржсакратар і тое, што зараз ідзе працэс стварэння сумесных беларуска-расійскіх вытворчасцяў. «Я лічу, што гэта вельмі добра, бо ў нейкім сэнсе ліквідуецца канкурэнцыя ўнутры Саюзнай дзяржавы і намаганні аб'ядноўваюцца для выхаду на знешнія рынкі».

Сярод іншага, Рыгор Рапота назваў адно з самых складаных пытанняў, якім зараз даводзіцца займацца, — уласнасць Саюзнай дзяржавы: «Гэта не простая тэма, але яна абавязкова патрабуе вырашэння. Паколькі тады мы створым мадэль, якую можна будзе выкарыстаць у Мытным саюзе і Адзінай эканамічнай прасторы».

Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы таксама адказаў на пытанне наконт спрэчкі аб 1,5 млрд долараў, якія Беларусь быццам павінна Расіі за недаплачаныя экспартныя пошліны па так званых «раствапральніках-разбаўляльніках». «Я не ўдзельнічаю ў гэтай спрэчцы, таму нічога змястоўнага не магу сказаць. Я ўпэўнены, што калі там спрэчка і існуе, то з ёй разбяруцца», — сказаў Рыгор Рапота.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## ■ Спорт

# ЛІГА ЧЭМПІЁНАЎ: Апошні «дынамаўскі» крок БАТЭ

**Мінск, вечар, родныя балельшчыкі на старэнькім стадыёне «Дынама»... Упэўнены, гэты крок для барысаўчан будзе цяжкім, важным і адказным. Шансы, каб трапіць у раўнд плэй-оф Лігі чэмпіёнаў у каманды Віктара Ганчарэнкі яшчэ ёсць, але для гэтага найперш трэба паспяхова сёння згуляць на «Дынама» супраць французскага «Ліля».**



Фота Надзеі БУЖАН.

Між іншым, гульня з французамі, аўтсайдарамі групы F, будзе апошняй для стадыёна перад рэканструкцыяй. Аднак асаблівых пачуццяў ад гэтага ў Віктара Ганчарэнкі няма.

— Настальгіі ці незадавальнення ад гэтага я не адчуваю, — на перадматчавай прэс-канферэнцыі кажа **Віктар ГАНЧАРЭНКА, галоўны трэнер БАТЭ**. — Неабходны новы стадыён, які будзе адпавядаць правядзенню групавых этапаў і далейшых стадый Лігі чэмпіёнаў. Мы разумеем, што «Дынама» ў сённяшнім выглядзе не зусім адпавядае патрабаванням. Таму я толькі за тое, каб яго зачынілі і хутчэй правялі рэканструкцыю.

Што тычыцца непасрэдна сустрэчы з «Лілем», Ганчарэнка прызнаўся, што настрой перад матчам у каманды добры, да канца сезона выбыў Аляксандр Паўлаў, магчыма на поле не выйдзе і нападаючы Дзмітрый Мазалеўскі, а ўсе астатнія футбалісты рыхтуюцца да сустрэчы з французамі.

Таксама спадар Ганчарэнка паразважаў аб тым, ці можна паядынак з «Лілем» назваць матчам года.

— У нас падобных за год шмат назбіраецца, — адказвае журналістам трэнер. — «Вардар», «Дэбрэцэн», «Хапаэль», «Баварыя», першы матч з «Лілем»... А таму і цяжка казаць, што гэта самы галоўны матч. Праўда, зыходзячы з турнірнай стратэгіі, напэўна, гэта будзе галоўны матч. А калі глядзець на ўзровень сапернікаў, дык ажыятажу больш было ад гульні з «Баварыяй».

Наконт саперніка Ганчарэнка выказаўся даволі стрымана, сціпла. Адзначыў, што гэта клуб з топ-чэмпіянату і ў першынстве Францыі адстае на тры балы ад вядомага «Пары Сэн-Жэрмэна», які на трэцім радку турнірнай табліцы. Больш дэталёвая інфармацыя прызначана для каманды. Аднак, каб зразумець патэнцыял «паўночных догаў», можна проста зазірнуць у склад каманды, дзе заўважым Саламона Калу, былога гульца лонданскага «Чэлсі», дасведчанага галкіпера Мішэля Ландро, двухразовага чэмпіёна Францыі, вопытнага чэха Давіда Разэгнала, чарнагорца Марка Баша, былога абаронцу маскоўскага «Лакаматыва». Падбор футбалістаў неблагі, але ў каманды ў параўнанні з мінулым годам відавочны крызіс. Змагацца і перамагаць «Ліль» можна. Тым больш у першым крузе, у гасцях, барысаўчане гэта ўжо ўдала рабілі. Пачатак сустрэчы — у 20.00. Чакаем вас на стадыёне!

# ЛАГОДНЫЯ «ЦМОКІ»

**Баскетбольныя каманды топ-узроўню ў Беларусь наведваюцца не так часта. А таму прыезд «зорак» аранжавага мяча заўжды збірае нядрэнную аўдыторыю. Вось і матч сталічных «цмокаў» з маскоўскім ЦСКА сабраў пад скляпеннямі «Мінск-Арэны» 6 тысяч гледачоў. Але, на жаль, сведкамі добрай гульні беларусаў яны не сталі. Масквічы далі «цмокам» сапраўдны майстар-клас сучаснага баскетбола.**

ЦСКА — гэта флагман не толькі баскетбольнай Расіі, але і ўсёй Еўропы. Клуб з вялікімі традыцыямі і выдатнай гісторыяй. «Армейцы» — шасціразовы пераможца Кубка еўрапейскіх чэмпіёнаў, яны 24 разы перамагалі ў першынстве СССР, 19 — у чэмпіянаце Расіі. Нягледзячы на пэўныя змены, за клуб выступаюць сапраўдныя «зоркі», якія маюць добры досвед выступленняў у амерыканскай лізе НБА. А гэта і расіянін Віктар Храпа, і серб Ненад Крысціч, а Мілаш Тэадосіч — лепшы баскетбаліст Еўропы-2010. І вось такая «машына» пад кіраўніцтвам італьянца Эторэ Месіны прыехала да нас у Мінск!

«Цмокі», пра якіх раней пісала «Звязда», выступаюць сёлета не вельмі добра. У Лізе ВТБ, турніры, які аб'ядноўвае лепшыя каманды Усходняй і Паўночнай Еўропы, яшчэ не атрымалі ніводнай вікторыі, але ў еўрапейскім Кубку Выкліку нядаўна перайгралі кіпрскі «Апалон». Здавалася, гэта павінна падбадзёрыць хлопцаў Андрэя Крываноса напярэдадні сустрэчы з ЦСКА, аднак розніца паміж расіянамі і кіпрыётамі — як паміж аўтамабілем і самакатам. Спадзявацца на выключна прыемныя эмоцыі ў матчы з грандам было вельмі складана. На мінскім паркеце расіяне пры падтрымцы сваіх балельшчыкаў дамінавалі ўвесь паядынак. Шанцаў у «Цмокаў» не было. Яны толькі аднойчы здолелі па балах наблізіцца да гасцей. Шкада, аднак у выніку зноў паражэнне. Буйное — 48:90. І гэта пры тым, што Месіна з-за шчыльнага графіка пакінуў у запасе сваіх лідараў — Храпу і Тэадосіча.

— Безумоўна, цяжка, калі выходзіш на паркет, а цябе літаральна «забіваюць», — рэзюміруе гульню Андрэй Крыванос, галоўны трэнер «Цмокаў». — Але гэта трэба перацярпець, прыняць. Як бы ні стараліся, зараз мы не можам супрацьстаяць гэтай камандзе. Мы саступаем менавіта ў тым баскетболе, які ёсць у нашай рэспубліцы. І чым больш будзем гуляць з грандамі, тым больш кожны будзе прымаць і выкарыстоўваць для сябе.

Са словамі трэнера нельга не пагадзіцца. Праўда, гэтае фіяска ад ЦСКА пакуль самае буйное ў супрацьстаянні з масквічамі.

— У мяне першапачаткова не было ілюзій наконт шанцаў на перамогу, — кажа **Аляксандр КУЛЬ, былы баскетбаліст каманды Крываноса, зборнай Беларусі, а цяпер генеральны дырэктар цэнтра эканамічнага развіцця і спартыўнага маркетынгу БК «Цмокі» (Мінск)**. — Хацелася, каб хлопцы саперніку далі бой. Спадзяюся, баскетбалісты, балельшчыкі не будуць блізка да сэрца прымаць гэты пройгрыш. Усё ж такі было б дзіўна спадзявацца на тое, што на гэтым этапе можна цягацца з ЦСКА. Для таго, каб годна выступаць на адпаведным узроўні, у Лізе ВТБ, перамагаць, бюджэт каманды павінен павялічыцца ў тры разы. І тады ўжо можна будзе размаўляць аб годным супрацьстаянні такім камандам, як ЦСКА.

**Тарас ШЧЫРЫ.** ■



Фота Надзеі БУЖАН.

г. Березино

**Извещение о проведении аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков**
**Организатор аукциона – БЕРЕЗИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**

| № лота | Местоположение земельного участка, кадастровый номер | Срок аренды, лет | Площадь земельного участка, га | Назначение земельного участка | Условия продажи | Расходы, связанные с проведением аукциона | Начальная цена объекта, доллар США по курсу НБ РБ на дату принятия решения | Сумма задатка, доллар США по курсу НБ РБ на дату принятия решения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Минская область, Березинский район, д. Глухой Ток 620480400001000029 | 50 | 0,4034 | Для размещения объектов неустановленного назначения (для строительства складских помещений) | – внесение победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; – возмещение победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона расходов, связанных с проведением аукциона на р/с 3602611000202 ЦБУ № 602 филиала № 612 ОАО АСБ «Беларусбанк» г. Борисов, код 810, код платежа 04616; расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ будут определены на основании счета-фактуры; – заключение победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона с Березинским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; – получение победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года; – осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией | 7 477 534 в т.ч.: 340 000 – за гос. регистрацию; 7 137 534 – за выполнение работ по формированию зем. участка | 227,28 (8 490 бел. руб. на 25.10.2012) | 22,728 |

**1. Аукцион состоится 20 декабря 2012 года в 10.00 в малом зале заседаний Березинского райисполкома по адресу: г. Березино, ул. Октябрьская, 18.**

2. **Заявления** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **принимаются** ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Березино, ул. Октябрьская, 18, 2-ой этаж, кабинет № 18 с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **до 16.00 17 декабря 2012 года.**

3. Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно–финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно–финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

4. Сумма задатка перечисляется на р/с 3602611000202 ЦБУ № 602 филиала № 612 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Борисов, код 810, УНП 600013635, код платежа 04002.

5. Аукцион признается несостоявшимся, если заявления на участие поданы менее чем двумя участниками. Предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

6. Победитель аукциона должен подписать протокол в день проведения аукциона. Внесение платы за предмет аукциона осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка.

7. Шаг аукциона – 5 процентов от предыдущей цены, называемой аукционистом.

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: 8 (01715) 5 57 71, 5 56 39.**

# ЯКАЯ ЯНА, ШЧАСЛІВАЯ СЯМ'Я?

## 380 «ЛІСТОЧКАЎ» РОДУ ГЛАЗКОВЫХ



Сям'я Глазковых з Віцебска сур'ёзна стала займацца генеалогіяй пасля таго, як знайшліся дзённікавыя запісы іх прапрабабак. На сённяшні дзень іх радавое дрэва налічвае 380 «лісточкаў» — менавіта пра стольких сваіх сваякоў сабраны звесткі!

Сям'я таксама працягвае традыцыі сваіх продкаў. Так, па прамой радавой лініі ўжо чатыры іх пакаленні настаўнічаюць.

Яшчэ адна традыцыя ў сям'і — называць дзяцей імёнамі продкаў. У сям'і захоўваюцца ручнікі, вытканыя яшчэ прапрапрабабкай Таццянай Гумінскай і прапрабабкай Ульянай Мікуліч! А яшчэ вышыўка прабабулі Веры Мікуліч, звязаныя ёю шкарпэткі і капялюшыкі, накідкі на падушкі, сурвэткі і абрусы. Сваё ўменне прабабуля Вера перадала дочкам, а яны — сваім дочкам і ўнукам, якія з вялікім задавальненнем зараз займаюцца вышыўкай, вязаннем і бісерапляценнем.

... — З чацвярга мы ўсе з вялікім нецярпеннем чакаем суботу, — шчабечуць Волечка і Верачка Глазковы. — Бо менавіта ў гэты дзень уся наша сям'я дома, і менавіта ў суботу мы ўсёй сям'ёй гатуем пельмені. Для аднаго чалавека гэта праца на цэлы дзень, а для сям'і — на дзве гадзіны. Адзін робіць цеста, другі ў гэты час перакручвае мяса на фарш... Лепім пельмені пры дапамозе пельменніцы. Затым іх раскладваем па поліэтыленавых пакетах і кладзём у маразілку.

— Як распавядала нам бабуля, гатаваць пельмені яе навучыў тата Дзмітрый Фёдаравіч, а яго — ягоная матуля Анастасія Мікітаўна, — падключаецца Яўген...

— Шчасце сям'і, калі дзеці здаровымі растуць, калі побач з табою верны, надзейны муж, калі цябе разумеюць і могуць заўсёды даравачь, калі і сам здольны іншых і сябе любіць. У нашай сям'і пануе атмасфера любові, цяпла, узаемаразумення і падтрымкі. А сямейны дэвіз: «Жыць, каб не было капрызаў», — кажа Таццяна Рыгораўна, маці сям'і Глазковых.

***Па рашэнні журы, у суперфінал выйшлі сем беларускіх сем'яў: ад Брэсцкай вобласці — сям'я Лаўрэнцік (Пінск), ад Віцебскай — сям'я Кліменцьевых (Полацк), ад Гомельскай — сям'я Галецкіх (Гомель), ад Гродзенскай — сям'я Локцевых (Масты), ад Магілёўскай — сям'я Глазковых (Магілёў), ад сталіцы — сям'я Ровенскіх, ад Мінскай вобласці — сям'я Дарошак (Жодзіна).***

## «МУЗЫКА СТАЛА НАШЫМ ЖЫЦЦЁМ»

У сям'і Ровенскіх з Мінска трое дзяцей і сямёра ўнукаў. У гэтай сям'і ёсць дзве прыгожыя традыцыі. Першая — з малых гадоў прывучаць дзяцей да беларускай народнай музыкі, аддаючы іх у музычную школу. Скрыпка, жалейка, гітара, бубен, губны гармонік, цымбалы, барабан — гэта далёка не поўны пералік музычных інструментаў, якімі яны валодаюць. А сямейны ансамбль Ровенскіх быў арганізаваны яшчэ ў 1980 годзе!

Сёння ансамбль налічвае 12 чалавек. Разам з Дзмітрыем Дзмітрыевічам і яго жонкай Лідзіяй Яўгенаўнай на сцэну выходзяць дачка Марыя і сыны-двайняты Васіль і Віталь, старэйшыя ўнукі Ліна, Лаліта, Ілона, Дзіма, Мікіта, і малодшыя — трохгадовыя Сафія і Цімафей.

У 2000 годзе сям'я Ровенскіх удзельнічала ў фальклорным фестывалі на Тайвані і заваявала там кубак «Лепшай сям'і». Летась аказалася лепшым музычным калектывам на конкурсе ў Сеуле. Дзякуючы свайму захапленню сям'я пабывала ў 40 краінах свету! Яны ўдзельнічаюць і ў дзіцячым фальклорным ансамблі «Дударыкі», арганізаваным Дзмітрыем Ровенскім на базе сталічнай гімназіі № 14, у якой Дзмітрый Дзмітрыевіч працуе настаўнікам музыкі. За гэтыя гады ансамбль сыграў больш за 100 беларускіх найгрышаў і полек амаль на 30 старадаўніх інструментах!



Другая «традыцыя» гэтай творчай сям'і — нараджэнне двайнятак. Так павялося ўжо здаўна. «І ў маёй бабулі Серафімы былі двайняты, і ў цёткі маёй жонкі, — кажа Дзмітрый Ровенскі. — А ў нас — сыны-блізняты і ўнукі-двайняткі».

На наша пытанне, ці магчыма поўнае раўнапраўе ў сям'і, Дзмітрый Дзмітрыевіч прызнаўся: «Камандую я, але шмат ідэй ідзе ад маёй жонкі, я да іх прыслухоўваюся».

## У НАШАГА ТАТЫ — УСЕ «ЗАЙКІ»...

Чатыры кветкі — 29-гадовая жонка Ірына, 8-гадовая Варвара і пяцігадовыя двайняткі Ульяна і Юліяна — радуюць вока і цешаць душу Івана Локцева з г. Масты Гродзенскай вобласці.

Ірына лічыць сваю сям'ю звычайнай. Праўда, адзначае, што за мужам яна з дзяўчынкамі як за каменнай сцяной. «Я бачу, што ён здольны забяспечыць сям'ю, ён стараецца, і я ўдзячная яму за гэта, — прызнаецца Ірына. — У сваю чаргу я даю яму адчуць, што ён у доме галоўны. Я давяраю Івану, у нас з ім поўнае ўзаемаразуменне. Безумоўна, бываюць дробныя канфлікты, але мы заўсёды знаходзім кампраміс...»

«Шчаслівай можна назваць любую сям'ю, дзе пануе лад, мір, узаемаразуменне, — гаворыць Іван. — Усе сем'і і ствараюцца дзеля гэтага. А як там далей атрымаецца — гэта ўжо залежыць ад мужчыны і жанчыны. У нашай сям'і — атрымалася!»

Гэтая прыгожая і дружная сям'я таксама амаль заўсёды разам. Тут лічаць, што мужу і жонцы абавязкова трэба быць сябрамі і мець агульныя захапленні. У іх такім захапленнем стала... рыбалка. І дзяўчынкам таксама спадабалася ездзіць разам з татам і мамай на Нёман, начаваць у палатцы.



А яшчэ яны разам ходзяць у госці, вандруюць па памятных мясцінах роднай краіны і нават запісваюць свае ўражанні ў агульнасямейным дзённіку «Беларусь мая сінявокая». І ўсе разам будуюць вялікі новы дом.

## «ЦЕСНА ПАВІННА БЫЦЬ РЭЧАМ, А НЕ НАМ!»

У гэтай сям'і муж і жонка называюць адзін аднаго не інакш як «Ірышка» ды «Дзімуля». Калі не сышліся ў чымсьці, не высвятляюць адносіны, а аддаюць перавагу памаўчаць нейкі час. Але такое бывае рэдка. «Нават калі б мой муж чагосьці не зрабіў, я б не «пілавала» яго. Не трэба пускаць свае адносіны пад адхон з-за дробязяў», — кажа Ірына Галецкая.



Ірына — настаўніца музыкі ў школе, вядзе яшчэ і танцавальны гурток.

Дзмітрый — інжынер-канструктар сельскагаспадарчай тэхнікі. Раней шмат часу аддаваў футболу, цяпер захапіўся настольным тэнісам. У вольны час праводзіць ранішнікі для дзяцей сваіх супрацоўнікаў. Быў ужо і парасём, і Карабасам...

Вова, 13 гадоў. Інтэлектуал, зараз удзельнічае ў рэспубліканскай алімпіядзе па матэматыцы, неаднаразова прымаў удзел у спаборніцтвах па шашках, у тым ліку рэспубліканскага маштабу, займаецца ў спартыўнай школе настольным тэнісам.

Маша, 12 гадоў, захапляецца шмат чым: фігурнае катанне, штодзённыя трэніроўкі па настольным тэнісе, член зборнай каманды юных ратавальнікаў, удзельнічае ў КВЗ.

Ксюша, 5 гадоў: фігурнае катанне, харэаграфія, вакал.

Сямейнае хобі — настольныя гульні, дзяўчынкі таксама любяць ладзіць хатнія канцэрты, тата па выхадных і святах пячэ торцікі. Час ад часу ў сям'і ладзяць тэматычныя вечарынкі. Не дзіўна, што тут часта бываюць госці!

«У нас поўнае раўнапраўе ў сям'і і поўны давер, — кажа Ірына. — Што тычыцца хатняй працы, мы з мужам усю яе робім разам».

Яшчэ ў гэтай сям'і ніколі і ні на што не скардзяцца. Ва ўсім імкнуцца знаходзіць плюсы. Нават калі жылі ўпяцёх у аднапакаёвай кватэры, падзялілі пакой напалам, зрабілі двухярусны ложак... «Цесна павінна быць рэчам, а не нам», — лічаць яны. А тры гады таму Галецкія ўехалі ў трохпакаёвую кватэру, якую пабудавалі як шматдзетная сям'я...

***Арганізатарам конкурсу выступае Міністэрства працы і сацыяльнай абароны пры ўдзеле Міністэрства адукацыі, Міністэрства культуры, Міністэрства інфармацыі, абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў. Падрыхтоўка рэспубліканскага конкурсу ажыццяўляецца пры падтрымцы грамадскіх аб'яднанняў і міжнародных арганізацый.***

## ПРЫГОЖАЯ СЯМ'Я Ў ПРЫГОЖЫМ ІНТЭР'ЕРЫ

Госці заўсёды гавораць, што ім не хочацца пакідаць кватэру сям'і Дарошак з Жодзіна. Жонка Марына ўсюды, дзе ні знаходзіцца — дома, на працы, у двары — імкнецца стварыць утульнасць і прыгажосць. Ды і кожны член гэтай дружнай сям'і ўносіць сваю лепту ў стварэнне творчай атмасферы. У выніку — карціны, кампазіцыі, незвычайныя лямпы...



Спальня аздоблена, як усходні будуар — тут любяць пасакрэтнічаць. Але найчасцей уся сям'я збіраецца ў гасцінай. А летам — на балконе, вялікім, як тэраса. Ён аформлены ў марскім стылі, тут стаіць утульны круглы стол, канапы. У двары — клумбы, альпійскія горкі, яркія дэкарацыі, створаныя іх рукамі... Хоць жыве сям'я не ў прыватным катэджы, а ў звычайным шматпавярховым доме.

Марына вельмі непрадказальная асоба, нават для самой сябе, а тым больш — для навакольных. Яна творчая, эмацыянальная, з бурнай фантазіяй. Муж Дзмітрый — больш рацыянальны, цвяроза глядзіць на жыццё. Марына, бывае, «тоне», прападае ў сваіх хобі, але муж заўсёды яе падтрымлівае. У сваю чаргу яна з разуменнем ставіцца да Дзімавых захапленняў. Дзевяцігадовы Данік і шасцігадовая Маргарыта таксама творчыя і артыстычныя. Данік захапляецца бальнымі танцамі, малюе. Маргарыта — разам з мамай выступае вядучай розных гарадскіх мерапрыемстваў.

Сакрэт сямейнага шчасця — у любові, у беражлівым стаўленні адно да другога, павазе, уменні даравацы памылкі, лічаць у гэтай сям'і.

**Святлана БУСЬКО.**

## СТО ПАЦАЛУНКАЎ ЗА ДЗЕНЬ

Аксана і Мікалай пазнаёміліся ў аўтобусе. «Я была яшчэ школьніцай, а Коля ўжо прыйшоў з арміі, — успамінае Аксана. — Гэта было каханне з першага погляду»... І вось ужо 16 гадоў яны разам. Зараз у сям'і Лаўрэнцік з Пінска растуць шасцігадовыя трайняты Яраслаў, Міраслаў і Аляксандра. Іх любыя і пяшчотныя сонейкі...

Гэту сям'ю без перабольшвання можна назваць спартыўнай. Аксана працуе ў дзіцячым садку выкладчыкам фізкультуры. Мікалай раней займаўся баскетболам, быў нават кандыдатам у майстры спорту. Цяпер захапіўся рыбалкай. Дзеці з задавальненнем ходзяць у басейн. Летам уся сям'я катаецца на веласіпедах, бавіць час на рэчцы, што працякае ля іх дачы. Зімой — санкі, лыжы. Дзеці з татам гуляюць у хакей. Прычым маленькая Аляксандра сказала: «Я таксама хачу!» і гуляе нараўне з хлопцамі. У яе крыху мужчынскі характар, распавядаюць бацькі. А вось Міраслаў адпавядае свайму імю: дабрадушны, мяккі, уважлівы. Яраслаў — вельмі таварыскі, любіць кампаніі, з'яўляецца галоўным татавым памочнікам...

— Мы з мужам усё робім разам, — гаворыць Аксана. — Да сваіх дзяцей прад'яўляем аднолькавыя патрабаванні: няма такога, каб тата сказаў нешта, а мама адмяніла яго рашэнне. Ці, наадварот, тата не падтрымаў маміну прапанову... А яшчэ дзяцей вельмі важна любіць і не менш важна — паказваць ім сваю любоў. Трэба як мага больш лашчыць іх і не баяцца, што яны вырастуць распешчанымі. Мы сваіх любім, ласкаем, абдымаем, цалуем па сто разоў на дзень!..

## «ГЛЕДЗЯЧЫ НА СВАІХ ДЗЯЦЕЙ, Я СТАЛА БОЛЬШ РАЗУМЕЦЬ ЛЮДЗЕЙ...»

Святлана і Міхаіл Кліменцьевы з Полацка ўпэўнены, што калі людзі хочуць, каб у іх была добрая сям'я, ім трэба вучыцца дамаўляцца. Святлана прызнаецца, што спачатку ў яе гэтага ўмення не было. «Але жыццё прымусіла, і я навучылася. Хоць у мужа ўсё ж больш падатлівы характар. Мы абое бываем упартымі, але я больш упартая», — самакрытычна дадае яна.

Многія сямейныя пары знаёмяцца падчас вучобы ва ўніверсітэце. Але гісторыя Святланы і Міхаіла больш цікавая. Справа ў тым, што Святлана вяла заняткі, а Міхаіл... быў студэнтам. Потым маладая дзяўчына (яна толькі-толькі прыйшла працаваць і была амаль аднагодкай сваіх студэнтаў) стала навуковым кіраўніком Міхаіла...

Сёння ў іх растуць шасцёра дзяцей. Старэйшай Наташы 9 гадоў, малодшанькаму Сяржу — паўтара годзіка. Два гады таму Святлане Кліменцьевай уручылі ордэн Маці.

Святлана прызнаецца, што з'яўленне дзяцей змяніла яе. Па-іншаму стала глядзець на многія рэчы, змянілася стаўленне да людзей.



Шэсць дзяцей у сям'і — і пры гэтым мама не выглядае вечна заклапочанай хатняй гаспадыняй. Лёгкая, какетлівая, абаяльная... Можа, сакрэт у тым, што ў гэтай сям'і ўжо з 1 года нікога не трэба адзяваць і карміць з лыжачкі? Дзяцей змалку прывучаюць да самастойнасці, заахвочваюць іх інтарэсы і захапленні. Яны спяваюць, складаюць вершы, малююць, займаюцца дзюдо, ходзяць у басейн... Так што графік жыцця ў сям'і вельмі насычаны.

Наогул, сям'я Кліменцьевых заваявала журы рэгіянальнага конкурсу сваёй асаблівай атмасферай — тым, што бывае цяжка апісаць словамі, але відаць з першага погляду. Гэта прыязнасць, узаемаразуменне, тое, як бацькі ставяцца да дзяцей, старэйшыя — да малодшых брацікаў і сястрычак, як малодшыя глядзяць на старэйшых... «Дзяцей выхоўвае тое, што яны бачаць, а не чуюць, — заўважае Святлана. — Дзеці бачаць, як паводзяць сябе дарослыя, і ў будучыні будуць рабіць гэтак жа».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

■ Тэму падказаў чытач

# ТЫ Ў «КАФЕ», А Я — У «КАВЯРНЮ»...

## ПОШУК ШЫЛЬДАЎ, НАПІСАНЫХ ПА-БЕЛАРУСКУ, ПАДОБНЫ ДА «ЦІХАГА ПАЛЯВАННЯ»

**Штодня большасць нашых суайчыннікаў купляе прадукты ў «магазине», а не ў краме, стрыгчыся ходзіць у «парикмахерскую», праводзіць вечары ў «кафе». Здавалася б, засілле шыльдаў і надпісаў па-руску на вуліцах беларускіх гарадоў даўно ўжо нікога не здзіўляе, а тым больш — не абурае. Аказалася, гэта не зусім так. У рэдакцыю «Звязды» даслала ліст Таццяна Іванаўна Міхасенка са сталіцы. І хоць напісаны ён быў на рускай мове, давялося прачытаць там наступнае : «А дзе надпісы на беларускай мове? Праехаўшы па Мінску, ці шмат іх знойдзеш? Дзе ж у такім выпадку нашы гонар і годнасць?»**

Што ж, надпісы на беларускай мове ў горадзе яшчэ можна сустрэць. Назвы вуліц і некаторых устаноў, мемарыяльныя дошкі на дамах. Да таго ж — бігборды з беларускамоўнай рэкламай прадукцыі сусветна вядомых кампаній. Выглядае гэта прыгожа, нават з адценнем нейкай элітарнасці. Тым не менш, такія прыклады ўключаць у матэрыял не стала. Як ні круці, мова на бігбордах — перш за ўсё ўдалы піяр-ход.

А вось шыльды на будынках тых жа крам ці цырульняў, напісаныя па-беларуску, — зусім іншая справа. Чаму менавіта на іх вырашана было звярнуць увагу? Па-першае, ёсць шмат людзей, якім прыемна і патрэбна паўсюдна адчуваць прысутнасць роднай мовы і культуры. Па-другое, калі глядзець на гэтае пытанне больш практычна, то дастаткова ўявіць, як турыст-іншаземец, прыехаўшы ў Беларусь, пачынае шукаць, дзе б падсілкавацца ці купіць сувеніраў, і сутыкаецца з неабходнасцю даведацца назву той кавярні ці крамы, дзе ўсё гэта можна знайсці. Падчас пошуку госць зусім не адчуе каларыту нашай мовы, бо назва гэтая напісана і гучыць па-руску. Вось так і адбываюцца смешныя выпадкі, калі пра Беларусь іншаземцы кажуць, што «гэта недзе ў Расіі». Няўжо прыемна, калі старонні не бачаць розніцы паміж нашай краінай і краінай-суседкай?

***У кампаніі «БелРэкламаСфера» (сярод кліентаў — група кампаній «Сквірэл», універсам «Рублёўскі», многія іншыя вядомыя кампаніі і буйныя банкі), якая з 2007 года займаецца вытворчасцю вонкавай рэкламы, у тым ліку і шыльдаў, на пытанне карэспандэнта пра замоўленыя шыльды на беларускай мове так і не змаглі прыгадаць ніводнага прыкладу. Па словах дырэктара ТАА «БелРэкламаСфера» Паўла Макарчанкі, за ўвесь час працы на беларускай мове яны рабілі хіба што шыльдачкі адміністрацыйнага характару для розных устаноў.***

1



2



Зразумела, на старонках газеты не змесціш усіх шыльдаў на беларускай мове, якія існуюць у Мінску, хоць іх, відавочна, няшмат. Працэс падрыхтоўкі гэтага матэрыялу чымсьці нагадваў паход у грыбы. Тут які галоўны прынцып? Калі будзеш уважлівым, абавязкова нешта знойдзеш. Вось і давялося быць уважлівай і насіць з сабой фотаапарат не адзін дзень. У выніку магу сказаць вось што. Большасць шыльдаў, напісаных па-беларуску, якія сустракала на мінскіх вуліцах — гэта «спадчына» з савецкіх часоў ці 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Гэта відаць перш за ўсё па вонкавым выглядзе шыльдаў. І ніякія дадатковыя каментары тут не патрабуюцца. Яшчэ адна катэгорыя шыльдаў на беларускай мове — кавярні ці рэстараны, дзе канцэпцыя заснавана на адметнасцях беларускай культуры.

Не будзем браць у разлік усім вядомыя шыльды на беларускай мове накшталт «Кнігарні» на галоўным праспекце ці ўжо даволі разрэкламаванай беларускамоўнай кавярні, якая нядаўна з'явілася ў сталіцы. Раёны-кварталы таксама могуць здзівіць веданнем роднай мовы, хай сабе і «шыльдавым». Здзіўлялі ніжэйпрыведзеныя прыклады кожны па-свойму...

Універсам з няхітрай назвай «Звычайны» **(фота 1)**. Пабачыць прадуктовую краму з такой шыльдай давялося на Лагойскім тракце. Слова «звычайны» — хоць і беларускае, але чуць яго ў назве крамы ну вельмі ўжо нечакана. Здаецца, наадварот, у бітве за пакупнікоў павінна ўхваляцца выключнасць і непаўторнасць. Думаю, пакінем гэта на сумленні таго, хто гэтую назву прыдумляў. Тым больш што людзі яе ўсё роўна, здаецца, не памятаюць. Калі адышла трохі і паспрабавала пацікавіцца ў мінакоў, дзе тут універсам «Звычайны», у адказ усе толькі паціскалі плячыма. «А што вам купіць трэба? Тут жа вунь яшчэ магазін ёсць. Зайдзіце», — нарэшце зжалілася нада мной нейкая бабулька і паказала акурат у бок «Звычайнага».

**ДАРЭЧЫ!**

***Шыльды на беларускай мове, вядома, маюцца не толькі ў Мінску. Калі ў вашым горадзе ці вёсцы таксама ёсць цікавыя прыклады, усе іншыя чытачы павінны абавязкова пра гэта ведаць. Так што не саромейцеся, шаноўныя, і дасылайце фота шыльдаў з вашай мясцовасці, напісаных па-беларуску, аздобіўшы яго невялічкім расповедам, на наш адрас: 220013, Мінск, вул. Багдана Хмяльніцкага, 10а, рэдакцыя газеты «Звязда» з паметкай «Шыльды» альбо на электронны адрас info@zvyazda.minsk.by. Лепшыя здымкі і каментары да іх будуць надрукаваныя на старонках газеты.***

3



4



«Набудзьце, калі ласка!», «Трыкатаж, адзенне, калыскі!» **(фота 2)**... Такія надпісы пабачыла зноў жа на Лагойскім тракце. На гэты раз беларуская мова знайшлася на вітрынах камісійнай крамы. Праўда, шыльда сцвярджала, што гэта «Комиссионный магазин» і выглядала значна больш новай, чым аздабленне вітрыны. Нават і не зразумееш адразу, чаму тут дзівіцца: ці то «мірнаму» суседству моўнай разнастайнасці ў афармленні крамы, ці загадкавым віражам лёсу, які гэтае суседства забяспечыў.

На адрэзку вуліцы Ульянаўскай ад стадыёна «Дынама» і да вакзала з шыльдамі па-беларуску, на першы погляд, неяк не густа. Але тут на табе — на адным будынку бачу ажно тры шыльды на беларускай мове: «Ламбард», «Ювелірная крама», «Ювелірная майстэрня» **(фота 3)**. Вырашыла, зноў жа, пацікавіцца ў мінакоў, дзе тут ювелірная крама. Пачала пытацца. У выніку, тры разы мяне адпраўлялі прайсціся да праспекта Незалежнасці, адзін раз — пад'ехаць два прыпынкі на трамваі і двойчы — «пашукаць што-небудзь» у гандлёвым цэнтры «Сталіца».

Гэтую шыльду крамы з лаканічнай назвай «Адзенне» сфатаграфавала на вуліцы Сурганава **(фота 4)**. Названай шыльдзе па праве належыць званне самай «маладой» з усяго спіса. Прынамсі, па знешнім выглядзе гэта адразу зразумела. «Адзенне» на Сурганава — гэта сэканд-хэнд. Вырашыла зайсці і паглядзець: можа, беларуская мова існуе ў гэтай краме не толькі на шыльдзе? Што здзівіла (хоць прадаўцы з пакупнікамі размаўляюць па-руску), інфармацыя пра новыя паступленні, якую ў той дзень я пабачыла ля касы, таксама была напісана на беларускай мове.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**
**Фота аўтара.**

■ Да ведама

# ЗАРПЛАТА «Ў КАНВЕРТАХ» ДА ДАБРА НЕ ДАВЯДЗЕ

## Ні наёмнага работніка, ні працадаўцу

**Па выніках мінулага года ў 3661-й арганізацыі малога бізнэсу на Гродзеншчыне, паводле справаздачнасці, сярэднямесячная зарплата склала менш за 1 мільён рублёў. Найбольш такіх арганізацый знаходзіцца ў абласным цэнтры (1694), Лідскім (565), Смаргонскім (189), Ваўкавыскім (165), Слонімскім (150) і Навагрудскім (137) раёнах. А ўвогуле падобных заробкаў у вобласці «дасягнулі» 57 % мікраарганізацый, што знаходзяцца на падатковым уліку, і 32 % малых прадпрыемстваў, як паведаміла начальнік інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Гродзенскай вобласці Лідзія СЯМАШКА.**

Калі арыентавацца на гэтыя лічбы, то многім прадпрыемствам вельмі далёка да пастаўленай задачы ў 500 долараў сярэднямесячнай зарплаты. Праўда, далёка не ўсюды падаюцца праўдзівыя звесткі ў справаздачах. Шмат дзе працягваецца практыка выдачы зарплаты «ў канвертах». Такія факты рэгулярна выяўляюцца, у прыватнасці, у сферы гандлю, тэхнічнага абслугоўвання і рамонту аўтамабіляў, будаўніцтва, паслуг таксі. Хаця прафілактыкі быццам і хапае.

— Падатковыя інспекцыі праводзяць сустрэчы з працадаўцамі ў арганізацыях з зарплатай, ніжэйшай за вызначаны дзяржавай мінімальны памер, пісьмова іх папярэджваюць аб недапушчальнасці парушэнняў у гэтай сферы, — зазначае Лідзія Сямашка.. Акрамя таго, такія суб'екты гаспадарання па нашай ініцыятыве разглядаюцца на пасяджэннях гаррайвыканкамаў. Аднак на чужых парушэннях, на жаль, вучацца не ўсе, а значыць, ім давядзецца адказваць згодна з заканадаўствам.

У прыватнасці, у шэрагу таксістаў зарплата складала каля 1 мільёна рублёў, а ў асобных — 500-600 і нават 300 тысяч рублёў. Напрыклад, адной фірме, якая дзейнічае ў сферы «паслугі таксі», па выніках праверкі даналічылі 66 мільёнаў рублёў падаткаў па прычыне заніжанай выручкі. Пры гэтым на падставе апытання было даказана, што таксісты атрымлівалі зарплату «ў канвертах».

Больш за тое, ёсць факты, калі кліентам прадастаўляюцца паслугі... нелегальнага таксіста. Аўтамабіль знешне выглядае, як мае быць, нават з плафонам, а на самой справе дыспетчар фірмы перадае заяўку кліента кіроўцы, які... не мае рэгістрацыі на прадпрымальніцкую дзейнасць.

Пасажырам быццам і няма розніцы, хто яго перавозіць. Але, з іншага боку, ёсць бюджэт, сродкі якога расходуюцца па розных сацыяльных напрамках і які павінен фарміравацца падаткамі ўсіх суб'ектаў гаспадарання. І хіба ж справядліва, што той жа пасажыр акуратна гэтыя падаткі плаціць, а «левы» таксіст арудуе «ў цені»?

— Кантрольныя органы адсочваюць гэту сітуацыю, — гаворыць Лідзія Сямашка. Але і чалавеку, які садзіцца ў таксі, неабходна разумець, з кім ён мае справу. Аўтамабіль павінен быць не толькі абсталяваны плафонам і адпаведнымі наклейкамі, але і мець у салоне пасведчанне і іншыя дакументы, якія пацвярджаюць дзейнасць гэтага кіроўцы ў рамках закона.

75 суб'ектаў гаспадарання, дзе памер сярэднямесячнага заробку не перавышаў двухкратнага бюджэту пражытковага мінімуму, уключаны ў планы праверак падатковымі інспекцыямі вобласці. Цікавяцца яны і дэкларацыямі аб даходах і маёмасці ў грамадзян, якія быццам і пакутуюць ад безграшоўя, але тым не менш робяць дарагія пакупкі. Сёлета ўжо ў 450 чалавек устаноўлена перавышэнне расходаў над даходамі і ў выніку спагнана ў бюджэт 842,2 мільёна рублёў. Напрыклад, адна жанчына, хоць і была зарэгістравана ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, аднак... не мела крыніц даходу. Што не перашкодзіла ёй затраціць 126 мільёнаў рублёў на пакупку кватэры і аўтамабіля.

У 41 індывідуальнага прадпрымальніка сёлета ўзніклі непрыемнасці па той прычыне, што наёмныя работнікі не з'яўляліся для іх блізкімі сваякамі альбо членамі сям'і. Прыцягнуты да адказнасці і 8 суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці, якія не заключалі ў пісьмовай форме дагаворы з наёмнымі работнікамі. У 7 арганізацыях зарплата наогул не выплачвалася: у цэлым крэдыторская запазычанасць на перыяд праверкі складала 107 мільёнаў рублёў. Акрамя таго, выяўлена 15 фактаў, калі выплата заробку не адлюстроўвалася на рахунках бухгалтарскага ўліку. Увогуле па гэтых фактах даналічана 200 мільёнаў рублёў.

Аб парушэннях, звязаных з выплатай заробкаў, інфармуецца абласное ўпраўленне Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы. У выніку сёлета аштрафавана 18 службовых асоб, праводзяцца пазапланавыя праверкі ў 7 фірмах, якія аказваюць паслугі таксі.

— Разам з тым хочацца ў чарговы раз звярнуцца і да наёмных работнікаў. Яны павінны разумець, што выдача зарплаты «ў канверце» — гэта не толькі ўхіленне ад падаткаў, страты для бюджэту, але і ўдар па інтарэсах работніка, яго сацыяльнай абароненасці. Пагаджаючыся на «шэрую» зарплату, людзі самі адмаўляюцца ад сваіх законных правоў у пенсійным забеспячэнні, паколькі памер пенсіі залежыць ад адлічэнняў у пенсійны фонд. Узнікаюць таксама праблемы з выплатай па бальнічных лістах, з атрыманнем банкаўскіх крэдытаў і па іншых пытаннях, — папярэджвае Лідзія Сямашка.

Ды і наймальнікам варта памятаць, што пры разліках па «ценявых» схемах яны не толькі дыктуюць «правілы гульні», але і самі трапляюць у залежнасць ад работнікаў. Работнік можа паскардзіцца ў кантрольныя органы, пасля чаго факт зарплаты «у канверце» практычна са стапрацэнтнай верагоднасцю будзе даказаны і да наймальніка прыменяць адпаведныя санкцыі.

Пры гэтым, на думку Лідзіі Сямашка, мэтазгодна заканадаўча прадугледзець магчымасць вызвалення грамадзян, якія паведамілі аб фактах заробкаў «ў канвертах», ад выплаты падаходнага падатку па такіх сумах. Абавязак па пералічэнні падаходнага падатку ў бюджэт варта ўскласці на працадаўцу, які не зрабіў гэта своечасова і ў поўным аб'ёме.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

Андрэй ГАЕЎ:

# «ПРАВАВАЯ ІНФАРМАЦЫЯ СТАЛА БОЛЬШ АПЕРАТЫЎНАЙ І ДАСТУПНАЙ ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА»

**На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае дырэктар Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Беларусі Андрэй Гаеў.**



**— Якім чынам дакладная прававая інфармацыя трапляе да спажыўцоў?**

— Наш цэнтр пастаянна займаецца развіццём дзяржаўнай сістэмы распаўсюджвання прававой інфармацыі як на папяровых, так і на электронных носьбітах. Тут, у першую чаргу, маецца на ўвазе інтэрнэт (www.pravo.by, www.ncpi.gov.by). Зараз можна з упэўненасцю казаць, што мы робім права даступным для ўсіх. І трэба падкрэсліць, што такая інфармацыя мае афіцыйны характар і падаецца аператыўна. Таксама ў сталіцы і абласных цэнтрах дзейнічаюць 7 нашых філіялаў — рэгіянальных цэнтраў прававой інфармацыі (РЦПІ), асноўная задача якіх — распаўсюджванне прававой інфармацыі на месцах.

**— Якія асноўныя кірункі дзейнасці НЦПІ па распаўсюджванні прававой інфармацыі?**

— У першую чаргу мы забяспечваем прававой інфармацыяй дзяржаўныя органы. На бясплатнай аснове ім прадастаўляюцца электронныя копіі эталоннага банка звестак прававой інфармацыі (інфармацыйна-пошукавая сістэма) «ЭТАЛОН», а таксама банк звестак прававой інфармацыі «Звод законаў Рэспублікі Беларусь».

ІПС «ЭТАЛОН» — гэта сістэма, якая дынамічна развіваецца і мае сучасны, эрганамічны інтэрфейс, графічны дызайн, вялікі набор функцыянальных магчымасцяў.

З улікам тэндэнцый развіцця інфармацыйных тэхналогій і паступовага замяшчэння друкаваных крыніц інфармацыі, у тым ліку прававой, электроннымі носьбітамі, доступ да прававых актаў з дапамогай НЦПІ могуць таксама атрымліваць суб'екты гаспадарання і грамадзяне. Для карыстальнікаў, якім не патрэбен доступ да ўсяго масіву прававой інфармацыі, цэнтрам арганізаваны выпуск тэматычных банкаў звестак на кампакт-дысках («Бізнэс», «Індывідуальны прадпрымальнік», «Кодэксы Рэспублікі Беларусь», «Праца і прафсаюзны рух»).

Акрамя фарміравання і вядзення дзяржаўных інфармацыйна-прававых рэсурсаў НЦПІ працуе ў галіне стварэння і папулярызацыі гісторыка-арыентаваных праектаў па праве. Серыя па гісторыі права Беларусі ўключае ў сябе тэматычныя банкі звестак «Помнікі гісторыі права Беларусі» (выпускі 1—3) і «Крымінальнае права Беларусі» (выпуск 1).

Іх можна набыць не толькі ў НЦПІ або РЦПІ, але і ў кнігагандлёвай сетцы.

Акрамя таго, цэнтрам заснавана серыя «Прававая бібліятэка НЦПІ» ў інтарэсах насельніцтва. У яе рамках выпушчаны зборнікі нарматыўных прававых актаў «Кіроўцам і тым, хто хоча імі стаць», «Правілы дарожнага руху і меры адказнасці за іх парушэнне», «Абарона правоў спажыўцоў», «Абарона правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг» і іншыя. З пачатку 2009 года па ўзгадненні з Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь друкаваныя выданні НЦПІ ўключаюцца ў Пералік сацыяльна значных выданняў, якія рэкамендуюцца для набыцця бібліятэкамі.

**— Якія навацыі ўнесены ў дзейнасць НЦПІ апошнім часам?**

— Адным з актуальных кірункаў развіцця з'яўляецца распрацоўка інтэрфейсаў узаемадзеяння з карыстальнікамі.

Яшчэ адзін важны аспект — забеспячэнне так званай cross-language пошукавай функцыі (беларуская і руская мовы). Дэ-факта банкі звестак прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца двухмоўнымі, пры гэтым адсутнічае практыка прыняцця прававых актаў на дзвюх дзяржаўных мовах адначасова. У гэтых умовах актуальнымі з'яўляюцца пытанні якаснага машыннага перакладу як запытаў карыстальніка, так і адказаў, якія даюцца інфармацыйнай сістэмай.

У гэтым кірунку ўжо дасягнуты пэўныя поспехі. У прыватнасці, у інфармацыйна-пошукавую сістэму (ІПС) «ЭТАЛОН» версіі 6.1 інтэграваны модуль машыннага перакладу з рускай на беларускую мову і наадварот.

Неабходна адзначыць і новы шматмоўны рэсурс — базу звестак «Слоўнік юрыдычных тэрмінаў на беларускай, рускай і англійскай мовах». Праект рэалізаваны НЦПІ ў 2010—2011 гадах у рамках правядзення работ па развіцці юрыдычнай тэрміналогіі нацыянальнага заканадаўства. На сённяшні дзень база звестак змяшчае больш як 7 тысяч тэрмінаў на рускай мове з перакладамі на беларускую і англійскую мовы. Лексіка ў поўнай меры адлюстроўвае разнастайнасць і асаблівасці сучаснай тэрміналогіі беларускага заканадаўства.

**— Аператыўнае распаўсюджванне прававой інфармацыі прадугледжвае развіццё сучасных тэхналогій. Што зроблена ў гэтай сферы?**

— Сёння мы валодаем сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі, якія актыўна выкарыстоўваем у сваёй працы. НЦПІ фарміруе і вядзе Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, які з'яўляецца асноўным дзяржаўным інфармацыйным рэсурсам у галіне права і прававой інфарматызацыі краіны ў інтэрнэце. На партале любы грамадзянін у свабодным доступе можа азнаёміцца са значнай часткай беларускага заканадаўства. Штомесяц партал http://www.pravo.by/ наведваюць да 200 тысяч карыстальнікаў. Нараўне з жыхарамі Беларусі сярод яго пастаянных наведнікаў зарэгістраваны прадстаўнікі больш чым 160 замежных дзяржаў, уключаючы Расію, Украіну, ЗША, Германію, Літву, Латвію, Польшчу і іншыя краіны.

Атрымаць доступ да поўнай і актуальнай версіі эталоннага банка звестак прававой інфармацыі (а гэта каля 150 тысяч прававых актаў) і судовай практыкі (больш як 17 тысяч дакументаў) можна з дапамогай інтэрнэт-паслугі «ЭТАЛОН-ONLINE» (www.etalonline.by). Дадзенай паслугай можна скарыстацца кругласутачна з любога пункта зямнога шара, падключыўшыся на перыяд ад адных сутак да паўгоддзя. Пра яе запатрабаванасць гаворыць і той факт, што на сайт заходзяць наведнікі не толькі з Беларусі, але і з больш як 50 краін свету, сярод якіх Расія, Украіна, ЗША, Германія, Швецыя.

**— Наколькі вядома, цэнтр распрацаваў і ўвёў у дзеянне Дзіцячы прававы сайт, які карыстаецца вялікай папулярнасцю ў падлеткаў...**

— За час свайго існавання з 2008 года Дзіцячы прававы сайт (mir.pravo.by) трывала заняў сваю нішу сярод інтэрнэт-рэсурсаў, выклікаючы цікавасць як у дзяцей, так і ў дарослых, набыў шмат верных сяброў і надзейных партнёраў. Штомесяц яго наведваюць больш за 10 тысяч чалавек са 100 краін свету, мяркуючы па водгуках, сайт, яго гульнявая, інфармацыйная частка ім цікавыя.

Асноўная мэта стварэння сайта — аказаць дапамогу маладому пакаленню ў атрыманні юрыдычных ведаў, адказаць на «дарослыя» пытанні, даць параду, што рабіць у розных сітуацыях, расказаць пра заканадаўства Рэспублікі Беларусь і правы грамадзян нашай краіны.

Сайт створаны НЦПІ па ініцыятыве Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь сумесна з шэрагам зацікаўленых арганізацый. Актыўна дапамагаюць гэтаму інтэрнэт-рэсурсу МУС, Дзіцячы Фонд ААН (ЮНІСЕФ) у Рэспубліцы Беларусь, Міністэрства адукацыі, Нацыянальны інстытут адукацыі, Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і іншыя.

За гады свайго існавання mir.pravo.by прыкметна ўдасканаліўся. Ён паспяхова прайшоў экспертызу, праведзеную Цэнтрам бяспечнага інтэрнэту ў Расіі пры Грамадскай палаце Расійскай Федэрацыі, Рэгіянальным грамадскім цэнтрам інтэрнэт-тэхналогій і кампаніяй «Скай Лінк» і ўключаны ў каталог бяспечных інфармацыйных рэсурсаў «Дзіцячы Інтэрнэт». У конкурсе «Лепшы сайт у сферы нефармальнай адукацыі за 2010 год» сайт заняў трэцяе месца і ўзнагароджаны дыпломам інтэрнэт-прэміі «ТІВО-2011». У яго інфармацыйнай частцы «Бібліятэка» з'явіўся новы раздзел «Карысная інфармацыя», дзе змяшчаюцца звесткі для дзяцей і падлеткаў, бацькоў, настаўнікаў. Акрамя таго, сайт абсталяваны інтэрактыўнай flash-картай свету з інфармацыяй аб замежных краінах, іх прававой сістэме. На ім арганізавана «Віртуальная прыёмная», дзе на пытанні адказваюць члены Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці. На mir.pravo.by праведзена восем дзіцячых конкурсаў. І гэта далёка не поўны пералік дасягненняў сайта.

**— Андрэй Анатольевіч, якія планы ў НЦПІ на будучыню, над якімі праектамі і праграмамі працуе?**

— Сёння пры функцыянаванні любой сістэмы, у тым ліку і дзяржаўнай сістэмы прававой інфармацыі (ДСПІ), прынцыпова важным момантам з'яўляецца эфектыўнасць яе арганізацыі. Таму мы плануем удасканальваць створаную сістэму і тэхналогію, што дазволіць аптымізаваць працу нашага цэнтра і дзяржаўных органаў у сферы збору, уліку, апрацоўкі, захоўвання, сістэматызацыі, актуалізацыі эталоннай прававой інфармацыі, яе распаўсюджвання (прадастаўлення), а таксама афіцыйнага апублікавання прававых актаў.

Мы і надалей маем намер развіваць і ўдасканальваць ДСПІ і дзяржаўныя інфармацыйна-прававыя рэсурсы, абапіраючыся на перадавы вопыт замежных калег, а таксама на агульнасусветныя тэндэнцыі развіцця прававой інфарматызацыі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**ОАО «Минскоблхлебопродукт»**
**извещает, что 30 ноября 2012 года состоится внеочередное собрание акционеров по адресу: г. Борисов, ул. Заводская, 4 (ф-л «Боримак»).**
Начало собрания **в 14.00**. Регистрация акционеров **с 13 часов.**
При себе иметь следующие документы: акционеру общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**
«О внесении изменений в устав открытого акционерного общества «Минскоблхлебопродукт».

*Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт»*
УНП 600013173 **Тел. 224 19 17.**





# АСЕТР — ЗА 120 ТЫСЯЧ, КАРАСЬ — ЗА 16...

**Госці і жыхары сталіцы змаглі набыць рыбу па выгадных цэнах: у Мінску прайшоў кірмаш «Рыба Беларусі-2012». Рыбаводныя гаспадаркі і рыбаперапрацоўчыя прадпрыемствы з усёй краіны прапанавалі шырокі асартымент сваёй прадукцыі па цэнах вытворцаў. Менавіта таму наведвальнікаў падчас кірмашу было шмат.**




Найбольш шырока была прадстаўлена жывая сажалкавая рыба. За кілаграм сярэдняга шчупака прасілі каля 32 тысяч, адборнага карпа — 28-30 тысяч. Самыя танныя карасі каштавалі ад 16 тысяч за кілаграм.



Асобна прыходзілі на кірмаш па чырвоную рыбу — кілаграм жывой фарэлі каштаваў каля 85 тысяч рублёў. Але да абеду першага дня амаль увесь далікатэс «расхапілі». Каштоўныя пароды рыбы — напрыклад, асетр і сцерлядзь — можна было набыць па 120 тысяч за кілаграм. Кірмаш парадаваў разнастайнасцю вэнджана-вяленай прадукцыі, астуджанай азёрна-рачной рыбай. Напрыклад, скумбрыя халоднага вэнджання каштавала 69 тысяч за кілаграм, карп адборны — 55 тысяч, карась — 35 тысяч за кілаграм.

Сёлета рыбгасы прапанавалі пакупнікам марожаныя паўфабрыкаты. Напрыклад, рыбны фарш з карпа (500 грамаў) можна было набыць за 28 тысяч, наборы для юшкі — ад 6 да 8 тысяч за кілаграм. Кулінары рыбаводных гаспадарак парадавалі наведвальнікаў кірмашу духмянай юшкай і барбекю.

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении открытого аукциона по продаже права аренды земельных участков

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Дата, время и место проведения аукциона, организатор торгов** | **Аукцион состоится 22 декабря 2012 г., в 11.00, по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45 КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью»** | | | | | |
| 2 | **Срок приёма документов** | **с 9.00 до 17.00 по рабочим дням по 18 декабря 2012 года** | | | | | |
| 3 | **Номер лота** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** |
| 4 | **Адрес земельного участка** | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Карла Маркса, 77 | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Полевая, 33 | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, пересечение улиц Ленинградской и Полевой | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Барташова,1/2 | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, микрорайон 3 | Гомельская область, Жлобинский район, Солонский с/с, д. Солоное, ул. Центральная |
| 5 | **Кадастровый номер участка** | 321850100002003299 | 321850100001001731 | 321850100001001703 | 321850100002003316 | 321850100002003316 | 321886403601000491 |
| 6 | **Площадь, га** | 0,5062 | 0,3061 | 0,0627 | 0,1403 | 0,0050 | 0,0048 |
| 7 | **Целевое назначение** | для строительства и обслуживания здания гостиницы (для размещения объектов гостиничного назначения) | для строительства и обслуживания промтоварного и продовольственных магазинов (для размещения объектов розничной торговли) | для строительства и обслуживания торгового комплекса (для размещения объектов розничной торговли) | для строительства и обслуживания здания садового центра (для размещения объектов розничной торговли) | для строительства и обслуживания площадки под сезонную торговлю (для размещения объектов розничной торговли) | для строительства и обслуживания торгового павильона, совмещенного с остановочным навесом остановочного комплекса (для размещения объектов розничной торговли) |
| 8 | **Срок аренды** | 50 (пятьдесят) лет | 15 (пятнадцать) лет | 50 (пятьдесят) лет | 10 (десять) лет | 3 (три) года | 10 (десять) лет |
| 9 | **Характеристика территории и расположенных на участке инженерных коммуникаций; строений и сооружений; инженерно-геологические условия** | Участок свободен от застройки (инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ) | | | | | |
| 10 | **Условия и ограничения** | Условия:<br>1. победителю либо единственному участнику несостоявшегося аукциона в течение 10 рабочих дней с даты утверждения протокола результатов аукциона (либо признания аукциона несостоявшимся):<br>- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке);<br>- возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков;<br>2. после совершения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона действий, названных в п. 1, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с Жлобинским районным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды государственную регистрацию прав, ограничений прав на земельный участок;<br>3. получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение Жлобинского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 1 год (Лоты №№ 1–4,6);<br>3.1 получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение Жлобинского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработку проекта благоустройства территории в сроки, определенные законодательством (Лот № 5);<br>4. приступить к строительству объекта в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта (Лоты №№ 1–4,6);<br>4.1 приступить к занятию земельного участка в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации (Лот № 5);<br>5. снять на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его согласно проектной документации;<br>6. завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией (Лоты №№ 1–4,6);<br>Ограничения:<br>7. 0,1226 га – водоохранная зона р. Днепр, охранная зона линии электропередачи, охранная зона сетей и сооружений газоснабжения (Лот № 1);<br>8. 0,3694 га – водоохранная зона р. Днепр (Лот № 1);<br>9. 0,0142 га – водоохранная зона р. Днепр (Лот № 1); | | | | | |
| 11 | **Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории** | Подключение к общим сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД. | | | | | |
| 12 | **Начальная стоимость, рублей** | 684 824 002 | 105 284 608 | 51 344 443 | 51 821 945 | 1 032 592 | 77 153 |
| 13 | **Сумма задатка, рублей** | 60 000 000 | 10 000 000 | 5 000 000 | 5 000 000 | 100 000 | 7 000 |
| 14 | **Затраты по изготовлению землеустроительной документации, рублей** | 4 115 340 | 4 308 080 | 3 579 880 | 3 745 399 | 3 020 932 | 3 701 574 |
| 15 | **Стоимость расходов по организации и проведению аукциона (ориентировочно), рублей** | 1 000 000 | 1 000 000 | 1 000 000 | 1 000 000 | 1 000 000 | 1 000 000 |

1. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь 26.03.2008 г. № 462.

2. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников. Не допускается продажа по начальной цене.

Победителем признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По заявлению победителя аукциона местным исполнительным комитетом предоставляется рассрочка внесения платы за предмет аукциона. Указанное заявление подается победителем аукциона в местный исполнительный комитет не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона. Решение о предоставлении рассрочки внесения платы за предмет аукциона принимается местным исполнительным комитетом в течение 5 рабочих дней со дня получения заявления о предоставлении рассрочки.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

После совершения победителем аукциона вышеуказанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, местный исполнительный комитет заключает с ним договор аренды земельного участка.

3. Если аукцион признан несостоявшимся в связи с тем, что заявление на участие в нем подано только одним участником, земельный участок предоставляется этому участнику при его согласии с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов, с выдачей ему в день признания аукциона несостоявшимся копии протокола о признании аукциона несостоявшимся.

В течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо обязаны внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

После совершения участником названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, местный исполнительный комитет заключает с ним договор аренды земельного участка.

4. Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) **в срок по 18 декабря 2012 года** подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка.

Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

5. Перечисление суммы задатка осуществляется на расчетный счет Организатора аукциона № 3012006530013 в филиале № 312 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жлобин, код МФО 151501673, УНН 490317354, сумма задатка победителя аукциона засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона.

Всем желающим представляется возможность предварительно ознакомиться с документами по объекту и с объектом в натуре. Контактные телефоны: **8 (02334) 3 14 08, 2 18 18.**

■ Май на ўвазе

# У МІНСКУ НАЗВАНЫ ЛЕПШЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ АЎТАСЭРВІСУ

Падведзены вынікі першага гарадскога конкурсу «Лепшая арганізацыя аўтасэрвісу». Як паведаміў начальнік упраўлення бытавога і гасцінічнага абслугоўвання насельніцтва Мінгарвыканкама Андрэй Новікаў, у ім узялі ўдзел каля 30 кампаній, занятых у сферы абслугоўвання і рамонту аўтамабіляў. Першае месца ў намінацыі «Лепшая арганізацыя аўтасэрвісу катэгорыі А» заняў калектыў сэрвіснага цэнтра сумеснага таварыства «Атлант-М Усход». У намінацыі «Лепшая арганізацыя аўтасэрвісу катэгорыі С» перамогу святкавалі прадстаўнікі акцыянернага таварыства «Мінск-Лада». Лепшым работнікам арганізацыі аўтасэрвісу прызнаны слесар па рамонце аўтамабіляў сумеснага прадпрыемства «Аўтасалон-AV» Дзмітрый Аўраменка. Заахвочвальнымі дыпломамі адзначаны спецыялісты таварыства «Хендэ АўтаГрад», прадпрыемства «Іванка-Еўра», а таксама старшы майстар аддзела тэхнічнага абслугоўвання таварыства «Атлант-М Холпі».

Пераможцы гарадскога конкурсу прадставяць Мінск на рэспубліканскім турніры.

*«Мінск—Навіны»*

■ Пачым скарбы зямлі?

# «ЧОРНЫЯ» БУДНІ ПОЛАЦКАЙ АРХЕАЛОГІІ

**Чаму ў самым старажытным горадзе Беларусі сёння адсутнічаюць ахоўныя дошкі з пазначэннем асобных гістарычных помнікаў, унесеных у Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў?**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Нядаўна прадстаўніком Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, пры ўдзеле супрацоўніка Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка і нарадам міліцыі, выкліканым на месца, быў затрыманы адзін з «чорных» капальнікаў. Яго раскопкі былі спынены літаральна праз 15 хвілін пасля пачатку. Але ўражвае і знаходка «археолага» — рамесныя прылады XI стагоддзя.**

Заўважыць сляды дзейнасці «чорнакапальніка» аказалася проста — разварушаная зямля, пашкоджаная перадмацэрыковая (самая старажытная) частка культурнага пласта. Скарбашукальнік быў «узброены» металадэтэктарам і рыдлёўкай. Супрацоўнікі музея-запаведніка на фотаздымку, зробленым падчас затрымання капальніка, прызналі ў ім... зацікаўленага слухача міжнароднай навуковай канферэнцыі «Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі», якая праходзіла сёлета ў Полацку. Адзін з дакладаў называўся «Унікальны помнік археалогіі — заходняя частка Запалоцкага пасада старажытнага Полацка: праблемы аховы і вывучэння». Відаць, апантаны археалогіяй «даследчык» вырашыў спрычыніцца да даследаванняў «чорных» папярэднікаў, чые вынікі дзейнасці былі прадэманстраваны падчас чытання навуковага даклада.

Полацк, нагадаю, сёлета адсвяткаваў 1150-годдзе. Аднак сюрпрызы самы старажытны горад Беларусі археолагам прыносіць па-ранейшаму.

— У 2004 годзе на вялізнай тэрыторыі (плошчай больш за 21 гектар) археалагічнай экспедыцыяй Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта быў адкрыты, па сутнасці, невядомы раней «горад у горадзе», — расказвае **Дзяніс ДУК, доктар гістарычных навук.** — Гаворка ідзе пра частку Запалоцкага пасада старажытнага Полацка. Калісьці гэта быў горад, а сёння тут голае поле. Археалагічныя раскопкі ў Запалоцці працягнуліся і ў 2006 годзе. Па іх выніках былі падрыхтаваны дакументы па ўключэнні гэтага ўнікальнага помніка археалогіі ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі. У лістападзе 2010 года беларускі Рэспубліканскі навукова-практычны Савет пры Міністэрстве культуры ўключыў новаадкрытую частку старажытнага пасада Полацка ў Спіс. Помнік з'яўляецца ўнікальным не толькі для айчыннай, але і для сусветнай археалогіі. Тут захаваўся некрануты культурны пласт канца X — сярэдзіны XII стагоддзяў. Такога няма ні ў адным са старажытных гарадоў Усходняй Еўропы — ні ў Кіеве, ні ў Ноўгарадзе. Нідзе! На велізарнай плошчы сяліліся мужы-палачане — прадстаўнікі элітных рамесных прафесій, а таксама вышэйшы пласт тагачаснага грамадства — полацкія баяры. Калі ўлічваць выключную каштоўнасць гэтага помніка археалогіі, мяркую, было б лепш, каб яго вывучалі нашы нашчадкі. Аднак навука і сёння не стаіць на месцы. Навуковыя публікацыі (па выніках нашых раскопак), якія ўбачылі свет у вядучых беларускіх і расійскіх навуковых выданнях, сталі знаёмы не толькі сумленным аматарам даўніны, але і тым, хто жадае ўзбагачэння ці рэалізацыі сваіх амбіцый праз скарбашукальніцкую дзейнасць. Урэшце, з 2006 года помнік стаў аб'ектам раскопак «чорных» капальнікаў...

Сёлета, паводле слоў Дзяніса Уладзіміравіча, з запалоцкім помнікам археалогіі здарылася і другая бяда. Побач размяшчаецца сучасны мікрараён Аэрапорт, які актыўна забудоўваецца. На шчасце, тэрыторыя старажытнага пасада не трапіла ў зону актыўнай забудовы, але гэта, як ні парадаксальна, не ўратоўвае помнік ад разбурэння. Так, будаўнікі адной арганізацыі-падрадчыка літаральна за адзін дзень, 8 чэрвеня 2012 года, без усялякага ўзгаднення з археолагамі выкапалі велізарны катлаван. Дзякуючы супрацоўнікам Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта і Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, работы былі спынены ўжо на другі дзень, але шкода была ўжо нанесена.

— Далей, што называецца, цікавей, — расказвае Дзяніс Уладзіміравіч. — Рабочыя, якія былі задзейнічаны на будоўлях мікрараёна, падчас абедзеннага перапынку наладзілі вываз на тэхніцы прадпрыемства-падрадчыка культурнага пласта з мэтай яго продажу прыватным асобам. Навошта? Аказалася, культурны пласт — гэта выдатны грунт для падсыпкі агародаў! Праблема яшчэ і ў тым, што на вышэйзгаданай тэрыторыі адсутнічаюць ахоўныя дошкі з пазначэннем статусу помніка археалогіі, яго межаў. Гэты клопат у кампетэнцыі мясцовых улад. Ды што там Запалоцце! У самым старажытным горадзе Беларусі сёння адсутнічаюць ахоўныя дошкі з пазначэннем асобных гістарычных помнікаў, унесеных у Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў, — Верхняга замка, Рагвалодава гарадзішча, Вялікага пасада і іншых. Адзіны ў Полацку такога роду маркер — таблічка з надпісам «Старажытнае гарадзішча», як кур'ёз, размешчана на месцы старажытнага паселішча.

Аднак вернемся да Запалоцця. «Чорныя» капальнікі ўзялі за правіла актыўна «працаваць» менавіта тут. «Дзякуючы» факту разбурэння культурнага пласта іх праца зараз вельмі аблегчана: не трэба капаць яму, здымаючы дзёран, можна «проста» папрасіць «дапамогі» ва ўладальнікаў будаўнічай тэхнікі — і раскоп літаральна за хвіліну будзе зроблены. Месцы такіх раскопаў ужо пераўтвораны ў сметнікі. Самы вялікі сметнік знаходзіцца на месцы катлавана, зробленага сёлета, у чэрвені. Цяпер з'явіліся сметнікі ў іншых частках Запалоцця.

Паводле слоў доктара гістарычных навук, натуральна, арганізаваць пастаянную ахову Запалоцкага пасада немагчыма. Аднак сітуацыю можна выправіць — дастаткова каб хаця б раз у дзень гэтая тэрыторыя трапіла ў маршруты патрулявання супрацоўнікаў міліцыі. Эфект будзе адразу: ніводны «чорны» капальнік не пойдзе на аб'ект, калі будзе ведаць аб адказнасці.

— Асабліва хочацца падкрэсліць, што адкрыць для шырокай грамадскасці вынікі нашых сёлетніх раскопак (рэчы і нерухомыя аб'екты матэрыяльнай культуры) зараз немагчыма па прычыне пільнай увагі нячыстых на руку людзей. Скажу толькі, што падчас археалагічных раскопак у 2012 годзе ў Полацку былі ўпершыню адкрыты сляды баярскіх сядзіб, знойдзены ўнікальныя артэфакты, якія, дзякуй Богу, ужо не трапяць на рынкі Санкт-Пецярбурга ці Масквы і не асядуць ў сховішчах пад канапамі «аматараў» гісторыі, — працягвае Дзяніс Дук. — Справа па ахове гісторыка-культурнай спадчыны — гэта не толькі клопат археолагаў, якія праводзяць палявыя даследаванні. Гэта, у першую чаргу, клопат усіх грамадзян. Мы ходзім па зямлі нашых продкаў, мы самі робім гісторыю, якая калісьці стане аб'ектам даследаванняў ужо нашых нашчадкаў. У Полацку ёсць выдатныя прыклады супрацоўніцтва з уладамі ўсіх узроўняў па справе аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Сёлета археалагічны атрад Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта праводзіў археалагічнае вывучэнне тэрыторыі Запалоцкага пасада на месцы пашкоджанняў культурнага пласта. Нам дапамагалі і мясцовыя ўлады (тэрыторыя на час правядзення раскопак была ўзята пад кантроль Дэпартамента аховы), і будаўнікі, якія прадастаўлялі магчымасць для захоўвання рабочага інвентару. Пакуль праводзіліся раскопкі, фактаў парушэння заканадаўства па ахове гісторыка-культурнай спадчыны не было выяўлена. Раскопкі спыніліся ў жніўні, а ўжо ў верасні будаўнічая тэхніка разбірала культурны пласт пад «наглядам» «чорных» археолагаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■ Гэта мы, Госпадзі

# Юля ўжо ніколі не вернецца...

## У Століне абвешчаны прысуд забойцам 13-гадовай дзяўчынкі

**Гэтае забойства ў навагоднюю ноч скалыхнула ўсю краіну. Два тыдні шукалі 13-гадовую дзяўчынку з вёскі Лядзец Столінскага раёна, якая прапала пасля дыскатэкі ў сельскім клубе 1 студзеня гэтага года («Звязда», 25 студзеня — «Адкуль нялюдскасць?»). Дзяўчынка не дайшла да дому літаральна сто метраў.**

У тую ракавую ноч яна была Снягуркай на вечары ў ДК. Паспяхова правяла праграму і каля 12 гадзін яшчэ прыбегла дадому, каб з бацькамі сустрэць Новы год. А потым, з іх дазволу, вярнулася на дыскатэку патанцаваць. Там быў амаль увесь яе клас і старэйшыя вучні таксама. Вярталася дамоў з сяброўкаю. Тую забіралі бацькі на машыне, яны прапаноўвалі падвезці Юлю да самага дому. Але яна весела адмовілася: прабегчы пяць хвілін па знаёмай дарожцы на свежым паветры здалося ёй такім натуральным завяршэннем навагодняй ночы.

Калі б Юля паехала да самых веснічак, у Лядцы, відавочна, была б іншая ахвяра... Бо як высветлілася ў ходзе следства, два юныя нелюдзі напярэдадні за пляшкай абмяркоўвалі, ці змогуць забіць чалавека, а ў навагоднюю ноч зноў вярнуліся да гэтай тэмы і вырашылі праверыць сябе. Ахвяру яны спецыяльна не выбіралі. Затаіліся на скрыжаванні дарог і напалі на першага, хто трапіў пад руку. Яны падкраліся ззаду, нацягнулі на вочы капюшон курткі і сціснулі горла... Затым доўга здзекаваліся з непрытомнай дзяўчынкі.

Паводле версіі следства, якая знайшла пацвярджэнне ў судзе, Карпавец гвалтаваў ахвяру, а яго падзельнік Галік толькі трымаў яе. Карпавец і дабіў яе ўдарамі па шыі. Потым яны закапалі цела за вёскай, а яе рэчы, фрагменты адзення раскідалі ў розных месцах, каб заблытаць следства. І дамовіліся аб тым, што на выпадак арышту любы з іх усю віну возьме на сябе, бо за групавое злачынства даюць большы тэрмін.

Назаўтра выпаў снег, які прыкрыў сляды зверскага злачынства. Юлю Ляшук выйшла шукаць уся вёска. Тут жа працавалі некалькі дзясяткаў міліцыянераў, супрацоўнікі МНС. Абыходзілі пустуючыя дамы, аглядалі навакольныя лясы, спецыялісты абследавалі вадаёмы. Зламыснікі былі побач і ўголас абураліся злачынствам. Карпавец нават удзельнічаў у пошуках, хадзіў з мужчынамі па закінутых хлявах і іншых пабудовах.

Пад падазрэнне траплялі многія жыхары вёскі, некаторых нават змяшчалі ў ізалятар, потым адпускалі з-за адсутнасцю доказаў. Для праверкі былі ўзяты ўзоры сліны ў 150 чалавек. 11 студзеня аналіз узялі і ў Валерыя Карпаўца. А праз некалькі дзён эксперты-крыміналісты выдалі заключэнне: на бялізне дзяўчынкі знойдзены генетычныя характарыстыкі, якія адпавядаюць геннаму матэрыялу Карпаўца. У той жа дзень яго затрымалі, ён ва ўсім прызнаўся і паказаў месца, дзе схавана цела.

Спачатку ён іграў ролю адзіночкі-забойцы, усю віну браў на сябе. А на пытанне, чаму так зрабіў, адказваў: «Быў моцна п'яны». А па вёсцы настойліва хадзілі чуткі, што душыцель быў не адзін. Пазней Карпавец усё ж назваў імя падзельніка. Праўда, Галік спачатку адпіраўся, стараўся ўсяляк блытаць следства, але потым усё ж прызнаў свой удзел у злачынстве.

У пачатку года абодвум фігурантам гэтай справы не было 18 гадоў. Карпавец нідзе не вучыўся і не працаваў. Па прычыне п'янства стаяў на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх. З сям'і, дзе ён вырас, сышоў бацька, які дарэчы, знаходзіцца ў месцах пазбаўлення волі. У маці ёсць іншыя дзеці ад іншых мужоў. Галік вучыўся ў сельгасліцэі, але таксама з малых гадоў выпіваў, курыў, вызначаўся дрэннымі паводзінамі. Апошні быў пад значным уплывам першага, асабліва ў справе п'янства. Нічога добрага з дзяцінства яны не бачылі ў сваіх сем'ях, не атрымалі хоць кроплю чалавечнасці ў спадчыну, яшчэ не сфарміраваную асобу кожнага на корані разбурала гарэлка.

Паводле слоў начальніка аддзела па наглядзе за законнасцю судовых пастаноў па крымінальных справах пракуратуры Брэсцкай вобласці Наталлі Васярчук, якая выступала абвінаваўцай, судовы працэс быў закрытым і вельмі цяжкім перш за ўсё для бацькоў Юлі. Прайшоў амаль год, а яны не апраўвіліся ад шоку. Юлечка была цудоўнай дзяўчынкай, яна паспяхова вучылася, захаплялася замежнымі мовамі, удзельнічала ў самадзейнасці, была ад прыроды таленавітым чалавекам.

Відавочна, што забілі ў той вечар не толькі дзяўчынку, але ў нейкім сэнсе і бацькоў яе. На пасяджэннях суда маці падтрымлівала сябе вялікімі дозамі медыкаментаў, а бацьку наогул не раз станавілася дрэнна, ён не здолеў прысутнічаць на ўсім судовым працэсе. Маці Юлі — медработнік, бацька — прадпрымальнік. Ёсць яшчэ малодшая дачка. Ад нараджэння Юля была слабенькім, хваравітым дзіцем. А потым, калі перарасла гэты перыяд, стала ператварацца ў сімпатычную разумную паненку, і гэта выглядала ці не ўзнагародай за першыя цяжкія гады яе маленства. Усё было ў іх добра. А потым жыццё паспяховай, станоўчай, перспектыўнай сям'і ў адзін міг перакрэслілі два непаўналетнія вырадкі. За што? Няма адказу на гэтае пытанне. І ніякія меры пакарання злачынцаў не здолеюць па-сапраўднаму аблегчыць боль родных і блізкіх Юлі.

Вердыкт пасяджэння судовай калегіі па крымінальных справах Брэсцкага абласнога суда вынесены. Карпавец атрымаў 15 гадоў пазбаўлення волі, Галік — 11 гадоў. Відавочна, калі б ім на момант злачынства споўнілася па 18 гадоў, тэрміны зняволення былі б намнога большыя. Але і гэты прысуд можа быць не апошнім. Пракурор, якая прасіла для абодвух максімальна магчымы тэрмін — 15 гадоў — не згадзілася з прыгаворам, пацярпелы бок таксама палічыў пакаранне для Галіка занадта мяккім. А самі асуджаныя, не выключана, будуць прасіць паменшыць тэрміны. Так што цалкам верагодны разгляд справы і ў Вярхоўным Судзе праз некалькі месяцаў. Што ж, у кожнага ёсць права абскардзіць рашэнне суда ў вышэйшай інстанцыі.

Паводле слоў Наталлі Васярчук, у ходзе судовага працэсу яна не адчула ніякага раскаяння з боку вінаватых. Адзінае, што адбілася на іх тварах пасля абвяшчэння прыгавору, — страх. Мабыць, яны ўжо адчулі, што турма — гэта не мёд.

Наталля Аляксандраўна абазначыла адну вельмі трывожную тэндэнцыю, якая была заўважана ёй, вопытным юрыстам, падчас разбору гэтай справы. Пасля невялікага роздуму яна назвала з'яву ёмкім беларускім словам «абыякавасць».

У той час, калі Юля ішла са злашчаснай дыскатэкі, з танцаў вярталіся таксама прыкладна сотня маладых людзей. Устаноўлена, што з Юлі здзекаваліся амаль гадзіну. Яшчэ раней аператыўнікі, а пазней члены судовай калегіі, не маглі паверыць, што ніхто нічога не чуў і не бачыў. Дапытвалі ўсіх: ніхто нічога не сказаў. Гаспадар дома, ля падворка якога адбывалася злачынства, таксама ішоў з гасцей. І ён нічога не бачыў, не чуў. Аднекуль жа ўзяліся чуткі, што Карпавец быў не адзін. Значыць, нехта бачыў, чуў, ведаў, а падзяліцца інфармацыяй з прадстаўнікамі праваахоўных органаў не захацеў. Людзі як быццам не разумеюць ці не хочуць разумець, што сёння пад руку злачынцам трапілася дачка суседа, а заўтра на гэтым месцы можа быць іх дачка.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■ На свае вочы

# ЗДЫМКІ НА АЙФОН,

## або Як нараджаецца новая канцэпцыя кіно

**Да нядаўніх часоў кіно, знятае на мабільны тэлефон, сур'ёзна ніхто не ўспрымаў. Сёння ж такія фільмы набіраюць усё больш папулярнасці, транслююцца на міжнародных кінафестывалях і вылучаюцца ў асобны від кінамастацтва. Нам выпала магчымасць пабываць на здымачнай пляцоўцы аднаго з такіх праектаў.**




...Дажджлівы і халодны лістападаўскі вечар. Сёмая гадзіна. Мы стаім перад турнікетам у фае Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», дзе нас павінна сустрэць Маша, дзяўчына, з якой мы пазнаёміліся напярэдадні па інтэрнэце. Нагода нашага візіту — здымкі праекта Departure («Адпраўленне»). Будучы фільм — з'ява сапраўды ўнікальная для беларускага кінематографа. Па-першае, гэтае кіно здымаецца выключна на айфон. Па-другое, над ім працуюць адначасова тры каманды ў розных месцах зямнога шара: у Амерыцы, Францыі і Беларусі. Па-трэцяе, праект стварае моладзь — студэнты і выпускнікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Заінтрыгаваныя да немагчымасці, мы чакаем.

Праз колькі хвілін да нас падыходзіць рудавалосая паненка з гарэзлівымі кудзеркамі — Маша (як потым высветлілася, другі рэжысёр і каардынатар праекта Марыя Янчык). «Зараз прывязуць абсталяванне, «матор» а 22 гадзіне. За гэты час можна пагутарыць з удзельнікамі здымачнай групы і акцёрамі», — абвяшчае яна «расклад».

Вырашыўшы не губляць час, разам з прадзюсарам Сяргеем Якубоўскім, рэжысёрам-пастаноўшчыкам Марыяй Курачовай і аператарам-пастаноўшчыкам Лінай Чайкоўскай рушым па студыйных калідорах у адзін з невялікіх пакойчыкаў. Там распачынаем гутарку. «Усё пачалося з таго, што тры гады таму Марыя напісала сцэнарый, — распавядае Сяргей. — Паводле яго ўдваіх з Лінай яны знялі работу, таксама на айфон». «У Беларусі тады праходзіў самы першы фестываль мабільнага кіно, і мы перамаглі ў галоўнай намінацыі», — удакладняе Ліна. Пасля гэтага маладых творцаў знайшоў прадзюсар Рубен Казанцаў, які і арганізаваў міжнародны праект.

Паводле задумы рэжысёра, сюжэт фільма драматычны, ахоплівае два часовыя пласты: 1998 год і нашы дні. Дзеянне адбываецца ў розных краінах: Амерыцы, Францыі і Беларусі. Сутнасць у тым, што ўсе лёсы і героі пераплецены. Тут і мафія, і асабістыя трагедыі... Ідэя — ва ўзаемасувязі ўсяго з усім. Здымкі беларускай часткі фільма, над якой працуюць нашы суразмоўцы, праходзяць не толькі на тэрыторыі кінастудыі, а ў розных пунктах, адпаведна сцэнарыю. У здымках бяруць удзел вядомыя беларускія акцёры Ігар Дзянісаў, Павел Яскевіч і Алег Вебер.



«Цяпер ідзе праца над тызерам (кароткім метрам для прыцягнення ўвагі. — **Аўт.**), у планах — здымкі поўнага метра, — натхнёна дзеліцца Марыя. — Гэтая кароткаметражка будзе прадстаўлена на двух кінафестывалях у Лос-Анджэлесе, такім чынам мы хочам заявіць аб праекце».

Пераходзім да размовы пра адметнасці працы. «Для мяне як для аператара галоўная складанасць у тым, што фільм трэба здымаць на айфон. Мы маем пэўныя абмежаванні па «карцінцы», але, тым не менш, можам стварыць цікавы прадукт. А вось, дарэчы, наша камера», — усміхаецца Ліна, дастаючы з кішэні тэлефон.

Звычайны апарат, пры поглядзе на які мяне ахоплівае сумнеў: няўжо на яго можна зняць «сапраўднае» кіно? «Ёсць розныя спецыяльныя прылады, аб'ектывы, якія павялічваюць аптычныя магчымасці камеры. З імі тэлефон пачынае выглядаць больш сур'ёзна», — супакойвае мяне Сяргей.

Пасля гутаркі выпраўляемся на здымачную пляцоўку. Усё дзеянне мусіць адбывацца на вуліцы, ва ўнутраным дворыку кінастудыі. Тут ужо стаяць грузавыя машыны з абсталяваннем, пачынаюць прыбіраць тэрыторыю, выстаўляць святло. Груваздкія пражэктары, святлоадбівальныя экраны, правады, рэйкі для пад'ёмнага крана, з якога будзе здымаць аператар — усё сур'ёзна, як у вялікім кіно.

Здымкі разлічаны на пяць дзён, мы апынуліся на пляцоўцы ў самы насычаны дзень — трэці. Пастаянна над фільмам працуюць 15 чалавек, сёння ж — усе 30. Сяргей Якубоўскі падкрэслівае, што праект малабюджэтны. Камандзе на добраахвотных пачатках дапамагаюць сябры і аднакурснікі.

Атмасфера пануе, што называецца, творчая. Аператар Ліна, заняўшы сваё месца на кране і схіліўшыся над камерай, вывярае кожны міліметр кадра, раздае каманды, што куды перасунуць, дзе стаць, дзе дадаць святла. Асістэнты, рэжысёры і іншыя памагатыя ў цёплых ватоўках ды пухавіках збягаюцца ў купкі, нешта абмяркоўваюць і тут жа імкліва разбягаюцца ў розныя бакі, апантаныя кожны сваімі думкамі.

Пакуль ідзе падрыхтоўка, нас праводзяць да акцёраў. У курылцы ўдаецца вылавіць выканаўцу адной з галоўных роляў — артыста Купалаўскага тэатра Паўла Яскевіча. П'ючы каву з пластыкавага кубка, ён распавядае, што раней ніколі не ўдзельнічаў у падобных здымках. «Я спачатку ўявіў, што на пляцоўцы будзе адна Маша (рэжысёр-пастаноўшчык Марыя Курачова — **Аўт.**) з тэлефонам у руках і яшчэ нехта, хто будзе бегаць з ліхтарыкам, — усміхаецца Павел. — Але адзіным адрозненнем ад здымак звычайнага кіно сталася толькі тое, што замест вялікай камеры — маленькі тэлефон. Арганізацыя, святло, грым — усё на ўзроўні, а часам нават і лепшае, чым на некаторых студыях».

...Тым часам набліжаецца дзясятая гадзіна вечара, а мітусня на пляцоўцы і не думае суцішвацца. У вялікім «прылазніку» паміж крытым павільёнам і дворыкам арганізоўваюць стол для здымачнай групы і акцёраў. На ім — кава, сыр, каўбаса, печыва, хлеб... «Частуйцеся!» — кроячы сыр, запрашае нас дзяўчына па імені Маргарыта. Яна часта дапамагае сябрам на здымачных пляцоўках, адказвае за харчаванне.



Нарэшце на пачатку адзінаццатай гучыць каманда вызваліць пляцоўку. Пачынаецца рэпетыцыя. Выконваючы ролі, тры акцёры выходзяць з дзвярэй, крыху прыпыняюцца на ганку, двое рушаць да джыпа, што стаіць на пляцоўцы... «Стоп!» — спыняе дзеянне аператар. Дубль. Потым — яшчэ і яшчэ...

...Паназіраўшы за рэпетыцыяй з паўгадзіны і ўшчэнт змерзнуўшы, мы вырашаем пакінуць пляцоўку. Пасля трох гадзін, праведзеных на адкрытай здымачнай пляцоўцы, разумееш, што кіно — гэта не толькі мастацтва. Гэта яшчэ і складаны, строга арганізаваны і зладжаны механізм.

Назаўтра я пацікавілася ў каардынатара Машы Янчык, як прайшлі здымкі. «А чацвёртай раніцы скончылі», — весела адказала яна. А я падумала: калі працуюць такія апантаныя людзі, у іх абавязкова атрымліваецца якасная рэч.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
**Фота Аляксандра ГАЛКОЎСКАГА**




Шчыра віншуем **Галіну Віктараўну РЫЖЭВІЧ**
з в. Ракаўцы Смаргонскага раёна **з 55-годдзем**.

*Жадаем шчасця, даўгалецця,*
*Здароўя, моцы і цярпення.*
*І кожны год, табой пражыты,*
*Хай падарункам будзе, святам,*
*А кожны дзень, бы колас жытні,*
*На радасць — поўным і багатым.*

**Сям'я БЫЧКОЎСКІХ,** г. Мінск.









# КАЦІСЯ Ў ЛУЗУ, ШАР!

## Фотарэпартаж з більярднай залы

**ДВА дні мінулых выхадных у більярдным клубе сталічнага бізнэс-цэнтра «Еўропа» былі аддадзены спаборніцтвам, і тут, на дзясятках більярдных сталоў ішлі сапраўдныя баталіі за кубак старшыні цэнтральнага савета Беларускага фізкультурнага спартыўнага таварыства «Дынама». Гэта быў трэці міжведамасны турнір па більярдным спорце, які яшчэ раз пацвердзіў, што більярд — гэта больш чым звыклае баўленне часу і грошай. Пра што яскрава сведчыў стол (адзіны незадзейнічаны стол), застаўлены кубкамі і медалямі.**

— У адрозненне ад мінулагодніх турніраў, у сёлетнім удзельнічалі 23 каманды (два гады таму — толькі дзевяць), — кажа адзін з арганізатараў Аляксандр Балцэвіч. — Па складзе ўдзельнікаў ён стаў самым прадстаўнічым на більярднай прасторы Беларусі.

Сярод каманд-удзельніц — міністэрствы ўнутраных спраў, па надзвычайных сітуацыях, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, пракуратуры, выканкама СНД, прадстаўнікі міністэрстваў эканомікі, фінансаў, спорту і турызму, Вышэйшага Гаспадарчага Суда, Мінгарвыканкама, Нацбанка Беларусі і МТБ банка, Інстытута нацыянальнай бяспекі, Беларускай чыгункі, Дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый, кампаніі «Белнафтахім», Белтэлерадыёкампаніі і, вядома, розных структур самога таварыства «Дынама».

— Більярд — гэта не проста здаровы лад жыцця і рэлаксацыя пасля працоўных высілкаў. Атмасфера і сама гульня спрыяе ўмацаванню мышлення, псіхалагічнай устойлівасці, джэнтльменству і культуры паводзін, — кажа Аляксандр Балцэвіч.

Важнасць мерапрыемства падкрэсліваюць удзел у ім намесніка генпракурора краіны Аляксея Стука і транспартнага пракурора Беларусі Анатоля Дудкіна, старшыні Цэнтральнага Савета спартыўнага таварыства Нацыянальнага алімпійскага камітэта «Дынама» генерал-маёра Юрыя Бародзіча, генеральнага сакратара НАК Георгія Катуліна.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОЖНЫ ПЯТЫ БЕЛАРУС ШТОГОД АБНАЎЛЯЕ МАБІЛЬНЫ ТЭЛЕФОН

Згодна з ацэнкай **дырэктара ІП «АйЦі-Макс» Аляксандра ТРУСЯ**, беларускі рынак мабільных тэлефонаў складае 1,6—2 млн мабільных устройстваў. За апошнія два гады назіраецца пераразмеркаванне попыту са звычайных тэлефонаў на смартфоны. У 2011 годзе 60% ад усяго продажу прыпадала на звычайныя мабільныя тэлефоны, а цяпер іх доля знізілася да 40%.

За тры кварталы 2012 года ў Беларусі прададзена 1,33 млн мабільных тэлефонаў, уключаючы 378 тыс. смартфонаў. Невялікае ажыўленне на рынку чакаюць у чацвёртым квартале: мяркуецца, што на працягу апошніх трох месяцаў будзе прададзена больш чым трэць усяго гадавога аб'ёму.

Найбольш папулярным сярод беларусаў сегментам з'яўляюцца смартфоны коштам $200—300. Другое месца па папулярнасці падзяляюць вартасныя сегменты смартфонаў у дыяпазонах $100—200, $500 і вышэй. У цэлым каля 70% усіх пакупак прыпадае на смартфоны коштам ад $100 да $400.

Сярэдні тэрмін выкарыстання мабільнага тэлефона ў Беларусі ўзрос з 3 да 4 гадоў. У будучыні пераразмеркаванне рынку ад звычайных да «разумных» тэлефонаў будзе працягвацца, лічыць Аляксандр Трусь. Аднак аб'ёмы рынку ў колькасным і вартасным выражэннях прыкметна расці не будуць.

**БЕЛТА.**

# ДЗЕЛЯ «МОВЫ НАШЧАДКАЎ МАІХ»

2012 ГОД КНІГІ




**Кніга, з якою я хачу пазнаёміць вас, дарагія чытачы «Звязды», — ілюстраваны слоўнік беларускай мовы для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў «Чую, бачу, гавару», які выйшаў у выдавецтве «Асар» якраз напярэдадні навучальнага года. Яго аўтар — пісьменнік, мовазнавец, знаны букварыст, заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь Анатоль Клышка.**

Вялікія старонкі і выдатныя малюнкі мастакоў М. Казлова і Н. Суставай, адзначаныя дыпломам «За лепшае выданне года» па выніках XLIV Рэспубліканскага конкурсу «Мастацтва кнігі».

Гартаю старонкі. Вось яно, дзіця, дома, і гэтыя беларускія словы напісаны на малюнках усіх пакаёвых рэчаў — на стале, крэсле, канапе, акне, шыбе, на падаконніку. Тут словы-вітанні і развітанні, звароты ветлівасці, здаецца, на ўсе выпадкі жыцця. Гартаю старонку за старонкай, і ўсюды россып родных слоў. Што ні прадмет — на ім роднае слова. Прыходзіш ва ўніверсам — і там вочы разбягаюцца ад ежы, пітва і, вядома, ад ласункаў. Заходзіш на пошту, і там свае словы. А такіх нагод-сустрэч з рознымі абставінамі жыцця ў кнізе аж 66! Дзіця атрымае сапраўдную асалоду ад сустрэчы з роднай беларускай мовай.

Як прыгожа ў гэтым слоўніку любяць нашы словы, сваю маму: *мама, мамачка, матуля, матулька, матулечка.* Не ў крыўду нямецкай ці англійскай, дзе ўсяго пару суфіксаў, а шчодра, бо ў нас шмат суфіксаў ёсць на выбар. Скажам: *тата, татка, татачка, татуля, татулька, татулечка.*

І як гэтак жа радасна бягуць нашы беларускія словы «з абдымкамі» суфіксаў да сваіх дзеда, бабы...

А як прыгожа па-беларуску падаюць свой голас нашы птушкі! Толькі паслухайце: салавей *цёхкае*, верабей *чылікае*, бусел *клякоча*, зязюля *кукуе*, журавель *курлыкае*, шпак *свішча*, сініца *цінькае*...

А як не даць разам з дзіцем волі лёгкай фантазіі. «Пра што мараць звяры?» Ды, пэўна ж, «бабёр пра электрапілу», «ваверка пра абцугі для арэхаў», «крот пра землярыйную машыну», а заяц «аб ракеце, каб уцякаць ад лісы». Чаму б сапраўды часам і не пажартаваць?

Ёсць у кнізе вельмі патрэбныя «засцярогі пры навальніцы», вартыя ўвагі не толькі малых, але і іх татаў і матуль. Хоць бы такія: «Не хавайся пад высокае дрэва. Не купайся ў рацэ, возеры... На роўным адкрытым месцы не стой, а ляж... Калі ты ў легкавой машыне, не выходзь з яе».

Красамоўна, з подпісам пад малюнкамі падаюцца такія паняцці, як *маладзік*, *падпоўнік*, *поўнік* і *ветах*, і тлумачацца квадры месяца: «Падпоўнік — першая квадра. Поўнік, поўня. Ветах, апошняя квадра».

А далей наша слаўная мінуўшчына: «Старыя замкі Беларусі» (Наваградскі, Крэўскі, Мірскі, Нясвіжскі), «Народнае адзенне», «Нашы арнаменты», добрая згадка пра талаку — форму сялянскай узаемадапамогі, калі нашы продкі грамадою ішлі на падмогу суседзям. Нашы народныя святы. І ў заключэнне — палітычная карта «Беларусь і яе суседзі».

І праз усю кнігу быццам падсвядома гучыць: «Любі, шануй, дарагі малеча, гэтае роднае слова, багатае, шчодрае на думку, колер, пах, смак... Каб і ты ўздыхнуў і прамовіў: «Чую, бачу, гавару»...

**Генадзь ШЭРШАНЬ.**

## БОЛЬШ ЧЫМ ДЗВЕСЦЕ ПЕНСІЯНЕРАЎ СТАЯЦЬ У ЧАРЗЕ НА КАМП'ЮТАРНЫЯ КУРСЫ

**У тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Фрунзенскага раёна сталіцы больш чым 200 пенсіянераў чакаюць сваёй чаргі, каб пачаць заняткі на камп'ютарных курсах.**

Як расказаў спецыяліст па сацыяльнай працы аддзялення сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі цэнтра Уладзімір Батура, цяпер тут адкрыты дзве групы. Заняткі праводзяць бясплатна, курс навучання разлічаны на 1-2 месяцы.

— Вялікая чарга звязана з тым, што не хапае педагогаў-валанцёраў і камп'ютараў, — адзначыў Уладзімір Батура.

На камп'ютарных курсах пажылыя людзі вучацца працаваць з інтэрнэтам, электроннай поштай, кантактаваць па скайпе. Папулярнасцю ў тэрытарыяльным цэнтры карыстаюцца і курсы па вывучэнні англійскай мовы.

*«Мінск—Навіны».*

## Даты. Падзеі. Людзі

**1717** год — 295 гадоў таму нарадзіўся Георгій Каніскі, беларускі царкоўны дзеяч, асветнік, філосаф, прапаведнік, пісьменнік. У 1743 годзе скончыў Кіева-Магілянскую акадэмію («з асаблівай пахвалой»), дзе вывучаў латынь, польскую, грэчаскую, старажытнаяўрэйскую, нямецкую мовы. У 1745-1755 гадах яе выкладчык, прафесар, рэктар. Ініцыятар адкрыцця Магілёўскай духоўнай семінарыі. З 1783 года — архіепіскап магілёўскі, мсціслаўскі і аршанскі, член Свяцейшага Сінода. Прыхільнік уз'яднання ўніятаў з Рускай праваслаўнай царквой. Свае ідэі выказваў у публічных выступленнях і царкоўных пропаведзях. Ім складзена і апублікавана каля 80 прамоў і прапаведзяў. Выступаў за распаўсюджванне асветы ў Беларусі. Пісаў вершы. Аўтар курсаў піітыкі («Правілы паэтычнага мастацтва») і філасофіі (на лацінскай мове), гістарычных запісак аб Магілёўскай епархіі, інтэрмедый, вершаў і іншых твораў. Памёр у 1795 годзе. У 1993-м кананізаваны праваслаўнай царквой.



**1899** год — нарадзіўся (вёска Селітрэнка, зараз Барысаўскі раён) Міхась Клімковіч, беларускі пісьменнік, крытык. Працаваў у школе, быў на партыйнай і прафсаюзнай рабоце. У 1934—1939 гадах — старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі. З 1943 года — галоўны рэдактар Дзяржаўнага выдавецтва БССР. Выступаў у друку ў розных літаратурных жанрах. Распрацаваў жанр драматычнай паэмы. Аўтар драматычных паэм «Кацярына Жарнасек», «Адплата», драматычнай трылогіі «Георгій Скарына», тэксту Дзяржаўнага гімна БССР (1944), лібрэта опер «Апошні вечар на хутары», «Кастусь Каліноўскі», балета «Князь-возера» і іншых твораў. Памёр у 1954 годзе.

**1947** год — нарадзілася Таццяна Іванаўна Казарэзава, беларускі вучоны ў галіне педагогікі, доктар медыцынскіх навук, прафесар. З 1986 года займалася вывучэннем праблемы медыцынскіх наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Прымала актыўны ўдзел у ліквідацыі наступстваў аварыі на ЧАЭС (1986-1987). Пры яе непасрэдным удзеле былі створаны дзяржаўны рэгістр захворвання дзяцей (апаластычная анемія і міеладыспластычны сіндром), які дазваляе аб'ектыўна ацаніць якасць здароўя дзяцей і ролю ўздзеяння малых доз радыяцыі ў генезе гэтай паталогіі.

### Было сказана

**Іван МЕЛЕЖ (1921—1976), празаік, драматург, публіцыст:**

*«Мары няясныя, няпэўныя,*
*але яны клічуць. Нястрымна».*

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Траста. Луста. Шыба. Маркс. Нета. Сага. Ласось. Маа. Ардыната. Тэмбр. Алах. Баскак. Блузка. Карова. Ном. Пот. Бляш. Ледакол. Тын. Тана. Рызыка. Уфа. Штурм. Набат. Асака. Тачанка. Атэстат.

**Па вертыкалі:** Ззянне. Абак. Алей. Тарос. Клопат. Рыба. Вока. Шыла. Сава. Кратон. Мара. Ласунак. Аншлаг. Раса. Рама. Клумба. Лубок. Ака. Спата. Барастат. Алея. Сума. Блізняты. Сера. Кошык. Цюлень. Храм. Намалот.

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.47 | 17.03 | 8.16 |
| Віцебск — | 8.42 | 16.47 | 8.05 |
| Магілёў — | 8.37 | 16.53 | 8.16 |
| Гомель — | 8.26 | 16.57 | 8.31 |
| Гродна — | 9.01 | 17.20 | 8.19 |
| Брэст — | 8.55 | 17.27 | 8.32 |

**Месяц**

***Першая квадра ў 16.32.***
***Месяц у сузор'і Рыб.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Валерыя, Кірылы, Міхаіла, Фёдара, Фядота, Яўгена.*

***К.*** *Анастасіі, Эдзіты, Анатоля, Фелікса.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— 40 гадоў, а паводзіш сябе як дзіця.

— Ды нічога падобнага! О, глядзі — арэлі вызваліліся!

**А вы заўважалі, што госці, сыходзячы, пытаюцца: «Мы нічога не забыліся?», а сваякі: «Мы ўсё ўзялі?»?**

— Хворы, я вам у соты раз паўтараю: склероз мы не лечым!

**Муж прыходзіць дадому, бачыць запіску на кухні: «Пайшла лячыць нервовую сістэму! Буду позна, п'яная».**

У дзяцінстве я баяўся цемры. Цяпер жа, калі я бачу свой рахунак за электраэнергію, я баюся святла.




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 26.520. Індэкс 63850. Зак. № 5238.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| М | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| П | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |

Нумар падпісаны ў 19.30 19 лістапада 2012 года.